ГОСУДАРСТВЕННАЯ НАУЧНАЯ БИБЛИОТЕКА

ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (у дарэвым падатках „Прафрук“)

На 2 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-61.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., шматгрэдніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідкі. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. надбаўку.

УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ПРАЛЕТАРЫ

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 26 кастрычніка 1930 г.
№ 251 (3849)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Да вынікаў пленуму ЦК КП(б)Б

Важнейшае значэньне пленуму ЦК КП(б)Б, які ўчора закончыў свае работы, акрэсьліваецца ўжо тымі пытаньнямі, якія вырашаў гэты пленум. У парадку дня сталі тры пытаньні: 1) чарговыя задачы гаспадарчага будаўніцтва, 2) аб ліквідацыі акруг і ўзмацненьні раёнаў і 3) аб задачах у галіне нацыянальнай палітыкі. Усё гэта важнейшыя, вузлавыя праблемы і задачы, на практычным ажыцьцяўленьні якіх партыя мабілізуе ўсе свае сілы, сілы рабочае класы і працоўных мас БССР.

Рэзультаты другога году пяцігодкі, падагуленыя пленумам ЦК КП(б)Б, далі магчымасьць зусім выразна сказаць, што мы цьвёрда і ўпэўнена прасоўваемся наперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, што мы перажовна змагаемся з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі. Лічбы 1929-30 гаспадарчага году цалкам пацьвярджаюць тое, што пляны пяцігодкі перавышаюцца, што лёзунг «пяцігодка—за чатыры гады» выконваецца на справе. Другі год пяцігодкі быў і ў БССР годам бальшавіцкіх тэмпаў, годам мабілізацыі пад кіраўніцтвам нашай партыі новых «унутраных рэсурсаў краіны», якія вылучаюцца ў тэй магутнай хвалі сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчных прамфінпляноў, грамадзкіх буксіраў, якой ахоплены найшырэйшыя масы рабочых і калгаснікаў.

Пленум з усёй цьвёрдасьцю падкрэсьліў, што ўсе гэтыя рэальныя дасягненьні ў будаўніцтве сацыялістычнай Беларусі магчымы былі толькі дзякуючы тэй правільнай генэральнай лініі, за якую змагалася наша беларуская арганізацыя на чале з Цэнтральным Камітэтам, дзякуючы таму змаганьню супроць правага апартунізму і «левых» перагібаў, якое вяла партыя.

Адзначаючы гэтыя буйнейшыя дасягненьні па ўсіх вучастках нашага будаўніцтва, пленум згуртаваў усю сваю ўвагу па тых далейшых задачах, якія высоўваюцца перад партыяй па бліжэйшы ўдарны квартал і на барацьбе за ліквідацыю тых прарываў, якія ёсьць у паасобных галінах будаўніцтва.

У пастановах па пытаньні **аб чарговых задачах гаспадарчага будаўніцтва** пленум падкрэсьліў тое асабліва важнае значэньне, якое набывае задача выкананьня гаспазадачага пляну асобнага ўдарнага кварталу (кастрычнік-сьнежань). Пленум ухваліў на гэты квартал апэрацыйны пляц, які вызначае наступныя асноўныя ліміты: рост валавой прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці вызначаецца супроць чацьвертага кварталу 1929-30 году—на 20,4 проц., рост рабочых—на 7,3 проц., рост прадукцыйнасьці працы — на 22,6 проц. (без дрэвапрапрацоўчай прамысловасьці) і 20,88 проц. па ўсёй прамысловасьці супроць сярэдняга гадавога ўзроўню 1929-30 году. Зьніжэньне сабекошту вызначаецца на 7,2 проц. супроць сярэдняга гадавога ўзроўню 1929-30 г., пры абавязковай умове дабіцца сапраўднага паслядоўнага зьніжэньня якасьці прадукцыі.

Выкананьне гэтых лічбаў, барацьба за якасьць прадукцыі прамысловасьці, барацьба за далейшую мабілізацыю шырокіх рабочых мас на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, барацьба за абавязковую ліквідацыю на пранягу ўдарнага кварталу ўсіх прарываў, усіх недавыкананьняў пляну—вось галоўныя задачы, якія стаяць перад усімі арганізацыямі КП(б)Б. Зусім відавочна, што гэтыя задачы могуць быць выкананы толькі пры самай рашучай і непрымірымай барацьбе з правым апартунізмам, з рэцыдывамі трацкізму, з бюракратызмам, з зацiскам самакрытыкі на прадпрыемствах, барацьбе за паварот прафсаюзаў Беларусі тварам да фабрык і заводаў.

XVI зьезд УсесКП(б) у сваім генэральным пляне разгорнутага сацыялістычнага наступленьня паставіў перад усёй партыяй задачу ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, якая заключаецца ў тым, каб да канца пяцігодкі закончыць у асноўным калектывізацыю сельскай гаспадаркі Савецкага Саюзу. Пленум ЦК КП(б)Б востра падкрэсьліў, што паасобныя арганізацыі нашай КП(б)Б ня сталі на чале новай хвалі калгаснага прыліву і што ў шмат мясцох існуе правапартуністычная стаўка на самацёк і пасьўнасьць у гэтай важнейшай галіне барацьбы за сацыялізм. З усёй энэргіяй разгарнуць работу на разьвіцьці калгаснага руху, стаць на чале новай хвалі калгаснага прыліву і кіраваць ім, захоўваючы ў працы па калектывізацыі бальшавіцкія прынцыпы, не дапускаючы апартуністычнага самацёку і перагібаў, весьці далейшую і пасупынную барацьбу за ліквідацыю куляцтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, — вось задачы, якія пастаўлены пленумам перад КП(б)Б.

Пленум зьвярнуў асаблівую ўвагу на пытаньні **жывёлагадоўлі**, разьвіцьцё якой зьяўляецца ў БССР адной з важнейшых задач у разьвіцьці сельскай гаспадаркі. Пляны па разьвіцьці жывёлагадоўлі павінны быць выкананы ўсімі адпаведнымі арганізацыямі **на ўсе 100 проц.** Якое-б ні было паслабленьне тэмпаў працы на гэтым вучастку—яно зьяўляецца зрывам нашых плянаў, зьяўляецца апартунізмам на практыцы.

Пленум абавязаў усе партыйныя арганізацыі, каб пляны ўсіх загатовак на БССР былі выкананы **не пазьней 1 сьнежня 1930 году.** Збожжазагатоўкі, бульбазагатоўкі, лесазагатоўкі і лесавывазкі, загатоўкі фуражу і тэхнічных культур павінны быць выкананы па-бальшавіцку **на ўсе 100 проц., без усякіх спазьненьняў.**

Вялікую ролю адыгрывае задача па мабілізацыі грашовых сродкаў насельніцтва і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў усіх гаспадарчых арганізацый. На выкананьне гэтай задачы трэба аддаць значна больш, чым да гэтага часу, увагі з боку партыйных арганізацый.

Бальшавіцкія тэмпы, барацьба з правым апартунізмам, з «левымі» загібамі і прымірэньцтвам да іх, мабілізацыя мас рабочае класы, калгаснікаў і вясковай беднаты вакол лёзунгаў партыі, рашучая барацьба супроць клясавага ворага дасьць магчымасьць нам з посьпехам выканаць усе гэтыя задачы.

Пытаньне **ліквідацыі акруг і ўзмацненьня раёнаў** зьяўляецца адным з важнейшых пытаньняў па палянізацыі і ўзмацненьні кіраўніцтва ўсім нашым будаўніцтвам у раёне. На раённае кіраўніцтва лажыцца зараз увесь цяжар работы па правядзеньні на справе асноўных пастаноў партыі ў галіне карэннай перабудовы вёскі на сацыялістычны лад. З ліквідацыяй акруг далёка не закончана работа, зьвязаная з ўзмацненьнем раёнаў. Пленум вывучыў увесь вопыт работы, якая ўжо праведзена КП(б)Б у галіне ўзмацненьня раённага кіраўніцтва. Далейшыя задачы па ўзмацненьні раёнаў стаяць пад знакам перабудовы работы як саміх раёнаў, так і цэнтральных устаноў. Павярнуцца тварам да саўгасаў, калгасаў і вёскі, значна палепшыць кіраўніцтва раёнамі з боку цэнтральных арганізацый, працягваць работу на ўзмацненьні раёнаў працаўнікамі, перабудаваць работу ячэйкі ў напрамку ператварэньня яе ў сапраўднага кіраўніка і арганізатара мас, значна больш увагі аддаць праблеме кадраў, выхаваньню камуністых,—усё гэта тыя канкрэтныя задачы, якія высунуты пленумам перад беларускай арганізацыяй. Узмацненьне раёну—цэнтральная задача нашай партыі. Гэта задача павінна быць ажыцьцёўлена КП(б)Б.

Адным з сур'ёзнейшых і асабліва важных пытаньняў было пытаньне аб бліжэйшых задачах **у галіне нацыянальнай палітыкі.** Пленум прайшоў пад знакам далейшага практычнага ажыцьцяўленьня тэй правільнай нацыянальнай палітыкі, якую праводзіла і праводзіць наша партыя. Мы ня можам спыніцца на тых вялікіх дасягненьнях, якія ёсьць у галіне ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі. Ад гэтых дасягненьняў партыя павінна ісьці і пойдзе да новых перамог, па шляху будаўніцтва сацыялістычнай Беларусі, беларускай пралетарскай культуры, па шляху ліквідацыі прыкмет фактычнай нацыянальнай няроўнасьці. Пленум паставіў перад арганізацыямі КП(б)Б задачы па ўзмацненьні кіраўніцтва з боку партыі ўсім нацыянальна-культурным будаўніцтвам. Партыя павінна арганізаваць і стаць на чале ўзмацненьня шырокіх рабочых мас у справу культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Пленум зьвярнуў вялікую ўвагу на далейшую работу па беларусізацыі, на барацьбу за павышэньне якасьці і тэмпаў беларусізацыі.

Пленум падкрэсьліў, што рабочыя масы пад кіраўніцтвам партыі павінны ўзяць на сябе ініцыятыву ў вывучэньні беларускай мовы, у ажыцьцяўленьні беларусізацыі дзяржаўнага, каапэрацыйнага і прафсаюзнага апаратаў, у вывучэньні гісторыі і эканомікі Беларусі. Пленум паставіў задачу аўладаньня партыяй узрастаючым рухам за стварэньне беларускай пралетарскай культуры, а таксама - ў падборы і ўцягненьні ў кіруючую партработу бальшавіцка вытрыманых кадраў беларускіх работнікаў. Праблема карэнізацыі кадраў, вылучэньня новых рабочых кадраў стаяла, як важнейшая праблема на пленуме. Далейшаму выкананьню гэтай праблемы павінна быць аддана сур'ёзная ўвага нашай партыі. Пленум паставіў задачу значнага ўзмацненьня работы сярод нацменшасьцяй (яўрэяў, палякаў, латышоў, літоўцаў і інш.). Партыйны савецкі і прафсаюзны апараты яшчэ не падыйшлі да задачы сыстэматычнага абслугоўваньня нацменшасьцяй. Тут трэба зрабіць карэнны пералом.

Зусім відавочна, што правільнае правядзеньне Ленінскай нацыянальнай палітыкі магло праходзіць толькі ў рашучай барацьбе з усімі відамі нацыяналізмаў і нацыяналістычнымі ўхіламі ўнутры партыі. Зусім таксама ясна, што пасьпяховае будаўніцтва сацыялістычнай Беларусі і ажыцьцяўленьне бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі можа і ў далейшым пасьпяхова праходзіць толькі пры ўмовах рашучай барацьбы супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як **галоўнай небясьпекі,** супроць контрэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, а таксама супроць яўрэйскага і польскага шавінізмаў. Партыя павінна ўзмацніць барацьбу з усімі гэтымі нацыяналізмамі. Партыя павінна высьвятляць яшчэ больш масам іх контр-рэвалюцыйную сутнасьць. Партыя павінна выкрываць перад масамі сутнасьць беларускага нацыянал-дэмакратызму, як саюзьніка польскага фашызму, як сілу, якая ставіць стаўку на інтэрвэнцыю.

Пленум ясна падкрэсьліў, што нацыянал-апартуністы зьяўляюцца агентурай контр-рэвалюцыі ў радах партыі. Нацыянал-апартуністы зьяўляюцца пралетарскімі буржуазных нацыяналізмаў, якія служаць справе капіталістычнай рэстаўрацыі, справе барацьбы супроць пралетарскай дыктатуры. **Пленум абвясьціў нясумяшчальнымі погляды нацыянал-апартунізму са знаходжаньнем у радах камуністычнай партыі.** Партыйныя арганізацыі павінны значна ўзмацніць барацьбу супроць нацыяналістычных ухілаў, супроць ухілу да вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць ухілаў да мясцовага нацыяналізму.

Пленум прайшоў пад знакам ліквідацыі тых прарываў, якія мелі месца ў БАН ды інш. установах. Пленум рашуча ўдарыў па тых нацыянал-апартуністычных элемэнтах, якія па гэтых вучастках ажыцьцяўлялі ня лінію партыі, а лінію нацыянал-дэмакратаў. Пленум паставіў у сувязі з гэтым выключыць са складу бюро ЦК і ЦК КП(б)Б Ігнатоўскага і перадаць справу ад далейшым знаходжаньні яго ў радах партыі ЦКК КП(б)Б. Вывад Ігнатоўскага з кіруючых органаў партыі гэта рашучы ўдар па нацыянал-апартуністычным, па нацыянал-апартуністычных элемэнтах. У сваёй работе ў Акадэміі Навук Ігнатоўскі стаў рупарам нацыянал-дэмакратызму і на практыцы, і ў тэорыі змагаўся супроць генэральнай лініі нашай партыі.

Прайшоўшы пленум паставіў перад КП(б)Б рад адказных задач, выкананьне якіх будзе азначаць наша далейшае разгорнутае сацыялістычнае наступленьне, нашу рашучую бязьлітасную барацьбу супроць клясавага ворага, барацьбу за ліквідацыю куляцтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, нашу барацьбу за нацыянальна-культурнае будаўніцтва, за сацыялістычную Беларусь. У гэтай барацьбе партыя будзе бязьлітасная ў адносінах да правапартуністычных, левазагібістскіх і нацыянал-апартуністычных элемэнтаў, якія імкнуцца зрываць сацыялістычнае будаўніцтва і перашкаджаць нашай барацьбе за выкарчоўваньне рэштак капіталізму.

Дружным сіламі, з бальшавіцкімі тэмпамі—за выкананьне пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б!

Увесь пралетарскі Бэрлін падтрымлівае мэталістых

Хваля рабочай салідарнасьці падымаецца ўсё вышэй

Ні малейшага зьніжэньня зарплаты

БЭРЛІН, 24. Сёньня адбылася агульна-бэрлінская канфэрэнцыя работнікаў рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Прадстаўнік акруговага камітэту нямецкай кампартыі тав. **Кунц** задаў у сваім дакладзе, што **бэрлінскія мэталістыя атрымалі буйную перамогу на першым этапе сваёй барацьбы супроць наступленьня капіталу.** Зараз неабходна дабіцца посьпеху на наступным этапе. **Бэрлінскія мэталістыя вымусяцца прызнаць любую трэцейскую пастанову, каторая будзе прадугледжваць хаця бы малейшае зьніжэньне зарплаты.** «Наша барацьба — заявіў тав. Кунц, — вядзецца за ажыцьцяўленьне пастаўленай рэвалюцыйнай прафапазыцыі. На ўсіх прадпрыемствах неабходна стварыць камітэты салідарнасьці для лапамогі бастуючым. Нашай энэргічнай работай мы зараз можам стварыць лепшыя магчымасьці для перамогі на наступных выбарах у фабзаўкомы.

Пасьля тав. Кунца выступалі шматлікія прадстаўнікі ад буйнейшых прадпрыемстваў. Ва ўхваленай рэзалюцыі ўказваюцца задачы прафапазыцыі ў барацьбе за перамогі мэталістых.

Растуць рады рэвалюцыйнай прафапазыцыі

БЭРЛІН, 24. Мясцовая арганізацыя рэфармісцкага агульнага нямецкага аб'яднаньня прафсаюзаў у Альстэрвэрда (Прусія), абгаварваўшы справаздачу 5-га кангрэсу Прафінтэрну, пастанавіла калектыўна ўступіць у рады рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Арганізацыя зьвярнулася з заклікам да іншых арганізацый агульна - нямецкага аб'яднаньня прафсаюзаў уступіць у рэвалюцыйную прафапазыцыю і падтрымаць яе барацьбу супроць прадпрымальцаў.

Рэфармістыя ў ролі паліцэйскіх ішчэек

БЭРЛІН, 24. Хваля салідарнасьці з бастуючымі мэталістымі з боку працоўных, якая ўсё ўзьнімаецца, дасягнула надзвычайных разьмераў. Уся пралетарская маса Бэрліна падтрымлівае мэталістых. Сёньня функцыянавалі 35 кухонь Міжрабпому. Дзеці бастуючых мэталістых узяты на час забастоўкі ў сем'і працуючых рабочых. На ўсіх заводах пашыраюцца падпісныя лісты. На многіх прадпрыемствах рабочыя пастанавілі адлічаць кожны тыдзень аднагадзінны заработак у карысьць бастуючых. Рабочыя ў ваколічных вёсках сабралі бульбу. Сяляне па ўласнай ініцыятыве абавязваюцца прывезьці бульбу ў горад.

Рэфармістыя, прадпрыемцы і паліцыя прыглядаюць усе намаганьні, каб перашкодзіць праяўленьню салідарнасьці працоўных. На многіх прадпрыемствах паліцыя арыштоўвае зборшчыкаў грошай, захапляе прадукты харчаваньня, якія зьбіраюцца ў карысьць бастуючых. **РЭФАРМІСТЫЯ ЗАЙМАЮЦЦА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ШПІЯНАЖАМ, ДАНОСЧЫЧЫ ПРАДПРЫЕМЦАМ АБ ДЗЕЯНЬНЯХ РАБОЧЫХ.** У арганізацыі дапамогі бастуючым сацыял-дэмакраты ня прымаюць ніякага ўдзелу.

Наступленьне прадпрыемцаў на зарплату

БЭРЛІН, 24. Прадпрыемцы па ўсёй краіне пераходзяць у наступленьне на зарплату. Адміністрацыя мэталюргічных прадпрыемстваў «Вэльза Юнд Монсі» у Альстэрвэрда (Прусія) пастанавіла вынімаць стаўкі зьдзельнай зарплаты некаторых катэгорый рабочых на 15 проц. На фабрыцы па вырабе шчэй у Лідэнвэрда (Прусія) рабочыя стаяць пад пагрозай 16-проц. зьніжэньня зарплаты. Падобныя паведамленьні атрымліваюцца з цэлага раду іншых раёнаў Нямеччыны.

Наступленьне прадпрыемцаў сустракае рашучае супрацўленьне рабочых, якія пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафапазыцыі рыхтуюцца да барацьбы. Рабочыя фірмы «Вэльза Юнд Монсі» у Альстэрвэрда аднадушна пастанавілі абвясьціць забастоўку.

ПРАЛЕТАРСКІ МЕНСК--БЭРЛІНСКІМ МЭТАЛІСТЫМ

Пьведамленьне аб гэраічнай барацьбе 140.000 бэрлінскіх мэталістых знайшло гарачы водгук сярод пралетараў БССР. На радзе прадпрыемстваў у часе абсуджэньня пераліку адбыліся лятучыя мітынгі. У рэзалюцыях, ухваленых на гэтых мітынгах, пралетарыі гор. Менску горача вітаюць бэрлінскіх мэталістых, якія ўступілі ў гэраічную барацьбу супроць сваіх клясавых ворагаў, і абяцаюць ім поўнае падтрыманьне. Так, **менскія рабочыя - пажарнікі** шчыра вітаюць Бэрлінскіх мэталістых, якія пад кіраўніцтвам КПН і рэвалюцыйных прафсаюзаў вядуць рашучую барацьбу супроць наступленьня капіталу і здраднікаў рабочае клясы — сацыял-фашыстых.

Зараз-жа пасьля мітынгу **рабочыя першай часьці пачалі збор сродкаў у фонд бастуючых мэталістых па падпісным лісьцю, 20 чалавек адразу падпісаліся на 60 рублёў. Рабочыя 2-й часьці адлічылі 1 проц. месячнага заработку.**

У рэзалюцыі **студэнтаў Беларускага Хэміка - Тэхналёгічнага Інстытуту** гаворыцца: «капіталістычны сьвет, які перажывае зараз глыбокі эканамічны крызіс, імкнецца выбрацца з яго шляхам наступленьня на рабочую клясу, пры ягоным павялічэньне эксплёатацыі рабочых».

130.000 бэрлінскіх мэталістых пачалі рашучы бой з капіталістамі за абарону сваіх інтарэсаў — інтарэсаў усяго пралетарыяту Нямеччыны.

— Змагаецца пралетарыі Нямеччыны супроць капіталістых, за савецкую Нямеччыну! Мы заўсёды гатовы зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы вам у вашай барацьбе.

Студэнты адлічваюць у фонд бастуючых 2 проц. сваёй стыпэндыі да заканчэньня забастоўкі.

Супрацоўнікі ЦВК БССР шлюць брацкае прывітаньне бастуючым мэталістым Бэрліна і заклікаюць увесь нямецкі пралетарыят, пад кіраўніцтвам нямецкай кампартыі, да рашучай барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, за савецкую Нямеччыну.

Агульны сход пастанавіў арганізаваць матар'яльную дапамогу бастуючым рабочым Бэрліна шляхам збору сродкаў па падпісным лісьце.

Агульны сход працаўнікоў Белторфу, агульны сход рабочых заводу «Полымя Рэвалюцыі» і школы ФЗУ пры заводзе «Полымя Рэвалюцыі» шлюць палкае прывітаньне Бэрлінскім мэталістым і абяцаюць сваё поўнае падтрыманьне.

ПАХАВАНЬНЕ АХВЯР СТРАШНАЙ КАТАСТРОФЫ

30-МІНУТКАЯ ЗАБАСТОЎКА - ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ

БЭРЛІН, 25. Сёньня ў Альсдорфе адбылося пахаваньне 262 ахвяр катастрофы на капальні «Вільгельм». Улада прыняла рад мер, каб не дапусьціць рэвалюцыйнай дэманстрацыі. Дэлегацыям рабочых водпуск на пахаваньне быў дазволен толькі пасьля паўзродзінай рэгістрацыі. Прадстаўнікі царквы, улады і прадпрыемстваў выступілі ў часе пахаваньня з прамовамі, у якіх стараліся аваліць віну на «нішчасны выпадак, за які ніхто ня можа несьці адказнасьці».

З Эссэна паведамляюць, што **амаль на ўсіх капальнях Рурскай вобласьці па закліку рэвалюцыйнай прафапазыцыі ў часе пахаваньня работы былі спынены на 30 хвілін у знак пратэсту супроць капіталістычнай рацыяналізацыі. (ТАСС).**

Жахлівыя вынікі капіталістычнай эканомікі

Звыш 400 гарнякоў забіта і 250 паранены

БЭРЛІН, 23. Лік ахвяр катастрофы на капальні «Вільгельм» у Рурскай вобласьці (Заходняя Нямеччына) дакладна ўсё-ж не устаноўлен. Паводле вестак, — **пік забітых вуглякопаў перавышае 400.** Значны лік забітых яшчэ не ўдалося выцягнуць з-пад зямлі.

Камуністычны дэпутат абласнога парляменту Прусіі тав. **Саботка,** — прадстаўнік рурскіх вуглякопаў, — заявіў прадстаўніком друку, што прычынай катастрофы зьяўляецца выбух удушлівых газаў у капальні. Тав. Саботка паведаміў, што камуністычная фракцыя яшчэ 4 тыдні таму назад заначала ў парляманце на тое, што на капальні «Вільгельм» **з прычыны няправільнага вядзеньня будаўнічых работ** накапілася вялікая колькасьць удушлівых газаў. **Адміністрацыя эканоміла на выдатках па будаўнічых работах і вяла іх без належных мер перасьцярогі, ня лічачыся з тым, што гэта пагражала жыцьцю сотен вуглякопаў.**

Рэвалюцыйная газэта **«Вуглякоп»,** якая выходзіць у гор. Альсдорфе (паблізу якога знаходзіцца капальня «Вільгельм»), патрабуе аддачы пад суд дырэктара трэсту, які ўладае капальняй. Газэта заклікае гарнякоў арганізаваць аднадзённую забастоўку пратэсту. **У Альсдорфе адбыліся дзьве вялікія дэманстрацыі рэвалюцыйных рабочых, апранутых у жалобныя чорныя кашулі.**

У сувязі з катастрофай цікава адзначыць паведамленьне, якое зьявілася ў буржуазнай газэце **«Дэйчэ Бэргвэркс-цэйтунг».** Паведамленьне паказвае, што **катастрофа ў капальні «Вільгельм» і выкліканыя ёю разбурэньні не паніжаць даходаў трэсту, якому належыць капальня, бо даходы гэтыя застрахаваны.** Паведамленьне «Бэргвэркс-цэйтунг» поўнасьцю растлумачвае, чаму прадпрыемцы наводзілі «эканомію», ня лічачыся з магчымасьцю аварый і катастроф.

Інфармацыйнае паведамленьне

20-25 кастрычніка адбыўся II-гі пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б 13-га скліканьня з удзелам сакратароў гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі.

На павестцы дня пленуму стаялі наступныя пытаньні: 1) аб чарговых гаспадарчых задачах; 2) аб узмацненьні раёнаў у зьвязку з ліквідацыяй акруг і 3) аб нацыянальным пытаньні.

Па ўсіх гэтых пытаньнях пленум ухваліў рэзалюцыі, якія будуць надрукаваны.

Пленум пастанавіў адкамандыраваць у распараджэньне ЦК УсесКП(б) другога сакратара ЦК КП(б)Б — тав. ВАСІЛЕВІЧА.

У зьвязку з грубымі скрыўленьнямі партыйнай лініі, якія дапушчаны тав. ІГНАТОЎСКІМ у часе яго работы ў Акадэміі Навук, пленум пастанавіў вывесьці тав. Ігнатоўскага са складу ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б і зьвярнуўся ў Цэнтральную Кантрольную Камісію КП(б)Б з просьбай разглядзець пытаньне аб магчымасьці далейшага знаходжаньня тав. Ігнатоўскага ў партыі.

Пленум пастанавіў кааптаваць у склад Цэнтральнага Камітэту тав. ШАРАНГОВІЧА, абраўшы яго членам Бюро і ДРУГІМ САКРАТАРОМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б.

Пленум пастанавіў перавесьці з кандыдатаў у члены Бюро ЦК тав. ХЛЕЎНІКАВА і абраў у члены Бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. БУДЗІНСКАГА, прызначыўшы яго АДКАЗНЫМ РЭДАКТАРАМ ЦО — ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА».

Пленум ЦК саюзу друкароў заслухаў дакладаб гомельскіх вытворчых манэўрах

„ВАША ІНІЦЫЯТЫВА—АДНА З БЛІСКУЧЫХ ПЕРАМОГ У БАРАЦЬБЕ ЗА НОВЫЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ФОРМЫ ПРАЦЫ“

„Палесдрук“ узнагароджаны сьцягам, прэміяваны пабудовай новай фабрыкі, сталовай, клюбу

МАСКВА, 25. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

ПЛЕНУМ ЦК САЮЗУ ДРУКАРОЎ, ЯКІ СЕНЬНЯ АДКРЫЎСЯ, ЗАСЛУХАЎ ДАКЛАД ГОМЕЛЬЧАН АБ ВЫТВОРЧЫХ МАНЭЎРАХ.

ПЛЕНУМ ПЕРАДАЎ ГОМЕЛЬСКІМ ДРУКАРОМ АДРАС, У ЯКІМ ГАВОРЫЦЦА:

«ВАША ІНІЦЫЯТЫВА Ў АРГАНІЗАЦЫІ МАНЭЎРАЎ — АДНА З БЛІСКУЧЫХ ПЕРАМОГ У БАРАЦЬБЕ ЗА НОВЫЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ФОРМЫ ПРАЦЫ».

ПЛЕНУМ ПАСТАНАВІЎ ПАСЛАЦЬ У ГОМЕЛЬ БРЫГАДУ УДАРНІКАЎ ДРУКАРОЎ БУЙНЕЙШЫХ ГАРАДОЎ, А ТАКСАМА ТРОХ ЖУРНАЛІСТЫХ МАСКОЎСКАГА ДРУКУ ДЛЯ ВЫВУЧЭНЬНЯ МАНЭЎРАЎ НА МЕСЦЫ.

УЗНАГАРОДЗІЦЬ «ПАЛЕСДРУК» СЬЦЯГАМ, ПРЭМІЯВАЦЬ НАБУДОВАЙ НОВАЙ ФАБРЫКІ, СТАЛОВАЙ, КЛЮБУ

ЗАЎТРА ДАКЛАД ГОМЕЛЬЧАН БУДЗЕ ЗАСЛУХАНЫ НА МАСКОЎСКІМ ЗЬЛЕЦЕ ЎДАРНІКАЎ.

ВЫДАВЕЦТВА УсесЦВО ПРЫНЯЛА ДА ДРУКАВАНЬНЯ БРАШУРУ АБ МАНЭЎРАХ, НАПІСАНУЮ ГОМЕЛЬЧАНАМІ.

Тав. ГЕЙ—ЧЛЕН РВС БВА

Тав. Гей, Канстантын Бэніямінавіч—сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Беларусі загадам войскам БВА № 201 ад 17 кастрычніка 1930 году, на падставе загаду РВС СССР № 779 ад 8 кастрычніка 1930 году назначаны членам РВС БВА.

Сакратарам райкомаў КП(б)Б

У рэзультаце недаацэнкі з боку раённых арганізацый значэньня пад рыхтоўкі калгасных кадраў, камплектаваньне смаляпянскіх аднагадовых курсаў кіраўнікоў калгасаў зрываецца.

ЦК прапануе безадкладна праверыць пасылку калгаснікаў на курсы забясьпечыўшы поўнае выкананьне разьвёрсткі.

Сакратар ЦК КП(б)Б—К. ГЭЙ.

Мацней пралетарскае кіраўніцтва калектывізацыяй

Карэнны пералом у разьвіцьці сельскае гаспадаркі СССР, паварот асноўных мас сялянства на сацыялістычны шлях разьвіцьця быў дасягнуты нашай партыяй на аснове правядзеньня правільнай ленінскай лініі, на аснове бязьлітаснага змаганьня на два фронты як з правым апартунізмам, так і «з левымі» загібамі і контр-рэвалюцыйным трацкізмам.

Асновай гэтага павароту зьяўляўся хуткі рост індустрыяльнай магутнасьці дыктатуры пралетарыяту. Толькі на базе росту сацыялістычнай індустрыі, у прыватнасьці індустрыі, якая выпрацоўвае трактары і машыны для тэхнічнага пераўзбраеньня сельскае гаспадаркі, магло разгарнуцца магутнае будаўніцтва новых гіганцкіх саўгасаў, узброеных перадавой тэхнікай, гэтыя саўгасы зьявіліся «тэй вядучай сілай, якая палегчыла паварот сялянскіх мас і накіравала іх на шлях калектывізацыі» (Сталін). **Толькі на аснове магутнага росту індустрыі стапа магчымым узмацненьне кіруючай ролі пралетарыяту,** якое забясьпечыла посьпехі калектывізацыі. Рашучае змаганьне з куляцтвам і вялікарная масавая работа, праведзеная ў вёсцы перадавымі рабочымі, адыгралі вялікую ролю ў справе разгортваньня калгаснага руху. У тых раёнах, дзе гэта работа была разгорнута асабліва моцна,—імсіна ў збожжавых раёнах,—працэс калектывізацыі найшоў найбольш хутка, і паварот сялянскіх мас у бок сацыялізму выявіўся найбольш акрэсьлена і рэзка.

Тлумачыцца гэты нячуваны посьпех у справе калгаснага будаўніцтва тым, што гэту справу ўзялі ў свае рукі перадавыя рабочыя нашай краіны.

На бачыць неабходнасьці актыўнага пралетарскага кіраўніцтва справай калектывізацыі—значыць скочвацца да тэорыі правапартуністычнага «самацёку». Гэта тэорыя глыбока чужая асноўным прынцыпам вучэньня Маркса і Леніна, бо яны ня бачыць неабходнасьці перабудовы сялянскае гаспадаркі, змазвае актыўную ролю пралетарыяту ў гэтай справе, змазвае вострасьць клясавага змаганьня, якое няўхільна суправаджае гэты працэс,—гэта тэорыя на справе расчышчае шлях для капіталу, яны няўхільна і стыхійна расьце з дробнае сялянскае гаспадаркі.

«Няма сумненьня, што кіруючая роля сацыялістычнага гораду вялікая і несумненная. На гэтым іменна і будуецца ператвараючая роля індустрыі ў адносінах да сельскае гаспадаркі. Ці не даволі гэтага фактару для таго, каб дробна-сялянская вёска сама пайшла за гораданм у справе сацыялістычнага будаўніцтва? Не, не даволі...» «Сацыялістычны горад павінен весьці за сабой сялянскую вёску, насаджаючы ў вёсцы калгасы і саўгасы і ператвараючы вёску на новы сацыялістычны лад». (Сталін).

Дзесяткі тысяч рабочых, лепшых прадстаўнікоў сваёй клясы, вядуць непасрэдную работу ў вёсцы. Мы маем на ўвазе 25-ці тысячнікаў, рабочых-партыйцаў з гарадоў, перакінутых на сталую работу ў вёсцы, шматлікія брыгады рабочых, якія накіроўваюцца ў вёску на часовую работу ў сувязі са збожжазагатоўкамі, пасеўнымі кампаніямі і, нарэшце, пэфскую работу фабрык і заводаў. Работа гэтых дзесяткаў тысяч рабочых адыграла гіганцкую ролю ў справе замацаваньня і разьвіцьця посьпехаў калектывізацыі.

Зараз пачынаецца новы магутны прыліў у калгасы. Ва ўсіх рэспубліках і абласьцёх нашае краіны арганізуюцца сотні і тысячы новых калгасаў, пашыраюцца старыя калектывы. Калгасы пераходзяць з нізкэйшых форм у вышэйшыя. Пасяжковыя т-вы перарастаюць у арцелі. Новыя пласты сярэдняцкіх гаспадарак пераходзяць на калгасны шлях.

Толькі што праведзеныя на ўсёй краіне дні калектывізацыі і ўраджаю далі новы штуршок прыліву ў калгасы бядняцка-сярэдняцкіх мас. Гэты рух усюды адбываецца побач з далейшым узмацненьнем кулацкай актыўнасьці, далейшым абвастрэньнем клясавага змаганьня. Асноўная задача заключаецца ў тым, каб гэта вялікарная новая хваля калектывізацыі была арганізавана і накіравана, была забясьпечана пралетарскім кіраўніцтвам. Трэба ясна зразумець, што бяз цьвёрдага пралетарскага кіраўніцтва гэты рух ня дасьць патрэбных рэзультатаў.

Між тым, сям там заўважаюцца адзнакі паслабленьня ўвагі да работы пралетараў фабрык і заводаў у вёсцы.

Партыйнае будаўніцтва

Партвучоба ў радзе раёнаў зрываецца

Паркалектывы і ячэйкі фармальна адносяцца да камплектаваньня сеткі партасьветы, падбору кадраў прапагандыстых

Ня толькі культпропы, а райкомы цалкам і іх кіраўнікі, адказваюць за тэарытычную вучобу партыйных мас

Па-баявому разгортваць партвучобу!

У рабоце парт'ячэек Капінкавіцкага, Тураўскага і Петрыкаўскага раёнаў партвучоба займае зусім нязначнае месца. Яна не зьяўляецца штодзённай справай ячэек у цэлым, а пераважна ўзвальваецца на апоргаў. Зразумела, што без дапамогі ўсёй арганізацыі нельга ўзмацніць і ўзняць на належную вышыню партыйнага выхаваньня.

У выніку недаацэнкі вучобы і адсутнасьці кіраўніцтва з боку парторганаў, летняя партвучоба ў гэтых раёнах была сарвана. У большасьці ячэек пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б не прапрацаваны і да гэтага часу. Апраўданьне такога становішча многімі ячэйкамі (Тураўская, Мстачковая, Рычаўская, Ветлынская) зводзіцца прыкладна да наступнага: «нам цяпер вучобай займацца няма часу, трэба праводзіць кампаніі, вучобай будзем займацца ў вольны час». Такія адказы сьведчаць аб неразуменьні ўзвязкі тэорыі з практыкай, аб неразуменьні таго, што вучоба і практыка павінны ўзаемна дапаўняць адно другое. Установа ЦК партыі аб тым, што «партасьвета павінна падпарадкоўваць сваю работу нашай канкрэтнай палітыцы», не ўсьвядомлена.

Першынная асьвета павінна дапамагчы кожнаму партыйцу самастойна праводзіць практычную работу, навучыць увязваць тэорыю з практыкай. Практыка, адарваная ад тэорыі, прыводзіць работу да «вузкага практыцызму» і дзяйніцтва. Тут трэба напомніць словы Леніна: «Вузкі практыцызм, адарваны ад тэарытычнага асьвятаньня руху ў яго цэлым, нераджае зьвярнуць рух па няправільны шлях».

Адрыў практычнай работы ад агульнай сыстэмы партасьветы прыводзіць да вузкага практыцызму, да няўменьня увязваць практычную работу з пастановамі зьезду партыі і яе генэральнай лініяй. Сувязь паміж тэорыяй і практыкай пачына спрыяць павышэньню якасьці работы.

Посьпех партвучобы на многім залежыць ад складу кіраўнікоў прапагандыстых школ і гурткоў. У Жыткавіцкім, Тураўскім і Петрыкаўскім раёнах справа вызначэньнем і падрыхтоўкай кіраўнікоў пастаўлена кепска. Галоўны недахоп — гэта адсутнасьць падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кіраўнікоў.

Вусім дрэнна пастаўлены ўлік партыйных сіл у раёне. У апорга Петрыкаўскага РК да прыезду ў раён прапрыгады існавала думка, што партвучобы пачынаць нельга з прычыны адсутнасьці ў раённай арганізацыі прапагандыстых сіл. Але варта было толькі спір прыцягнуцца да складу раённай партарганізацыі, як «довады» апорга рухнулі. На Клімавіцкім фанэрна-лесапільным заводзе было выяўлена 9 асоб, якіх можна скарыстаць у якасьці кіраўнікоў школ. Як агульнае зьявішча, парт'ячэйкі часта перагружаюць кіраўнікоў іншай работай, што перашкаджае іх падрыхтоўцы, якасьці правядзеньня заняткаў і ў канчатковым выніку спрыяе адсеву слухачоў.

У часе работы па арганізацыі сеткі партасьветы ў паказаных раёнах выяўлена вялікая цяга да вучобы партыйцаў, камсамольцаў, беспартыйных рабочых і калгаснікаў. Задача парт'ячэек — арганізаваць гэту цягу вакол партасьветы, зрабіць партвучобу сродкам павышэньня тэарытычнага ўзроўню партыйных мас, ушчыненьня пырокіх мас у сацыялістычнае будаўніцтва, сродкам падрыхтоўкі і ўцягненьня беспартыйнага актыву у рады партыі.

БЕРАЛОВІЧ.

Па партарганізацыях

ДРЫСА. У раёне арганізавана 10 першапачатковых школ, 6 камсамольскіх, 2 ВСПШ і два гурткі бягучай палітыкі. Ва ўсіх школах займаецца 394 таварышы, з іх 95 чалавек беспартыйнага калгаснага актыву. Заняткі праводзяцца па два разы ў дэкаду. Праведзены двухдзённыя курсы прапагандыстых па мэтадычнай распрацоўцы пытаньняў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б.

Прапбрыгада.

БОРКАВІЧЫ. Камплектаваньне сеткі партасьветы ў раёне закончана. Галоўным недахопам у рабоце школ партасьветы — невыстарчальная падрыхтаванасьць кіраўнікоў і адсутнасьць патрэбных падручнікаў. Райком павінен забясьпечыць умовы кіраўнікам для іх падрыхтоўкі.

Ш. З. К.

АСЬВЕЯ. Раённая партыйная і камсамольская арганізацыі ахоплены партвучобай на 100 проц. Апрача таго, у школах займаюцца 114 чал. актывістых-калгаснікаў. Склад кіраўнікоў школ і гурткоў падабраны добры.

Прапбрыгада.

ЧАШНІКІ. Першыя заняткі школ і гурткоў партасьветы амаль ва ўсіх ячэйках раёну сарваліся. Парткалектывам фабрыкі «Чырвоная Зорка» ў дні партвучобы праводзіліся сходы цэхавых парт'ячэек. Месца для заняткаў на фабрыцы не падрыхтавана.

Кіраўнікі партшкол і гурткоў перагружаны іншай работай і ня маюць магчымасьці рыхтавацца да заняткаў. Патрэбны рашучыя меры да недапушчэньня зрыву партвучобы.

С.

МЕЖЫ. Партвучоба ў раёне пад пагрозай. Да гэтага часу арганізавана толькі тры пачатковыя школы. Многія ячэйкі ў гэтай справе бязьдзейнічаюць. На сетку партасьветы не хапае кіраўнікоў. Акруговыя работнікі Шаёнак і Гадасін, якія былі прызначаны ў раён на прапагандысцкую работу, адмовіліся ад работы ў раёне.

К.

Зрыў заняткаў увайшоў у сыстэму

Зрыў заняткаў па сетцы партыйнай вучобы на радзе буйнейшых прадпрыемстваў Кастрычніцкага раёну ўваходзіць у сыстэму. Прычына такога зьявішча—недаацэнка вучобы парткалектывамі і ячэйкамі. Яркім прыкладам нядбайных адносін да разгортваньня партвучобы зьяўляюцца разважаньні і паводзіны сакратара парткалектыву чыгункі МББ Крылова. Замест вызначаных 12 дзён у месяц для партвучобы, Крылоў абмяжоўваецца 9 днямі. 18 кастрычніка па распараджэньні Крылова партвучоба на чыгунцы была адменена, таксама па яго віне ў гэты-ж дзень была сарвана вучоба і на заводзе «Полымя Рэвалюцыі». Яўку 90 чалавек на заняткі, замест 700 запісаўшыхся, Крылоў лічыць нармальным зьявішчам. Відома, такія адносіны да партвучобы ня маюць нічога агульнага з дырэктывамі партыі наконт гэтага.

На заводзе «Энэргія» зрываецца партвучоба з тае прычыне, што ў дні вучобы пасылаюцца людзі на сартоўку бульбы, 18 кастрычніка на заняткі паліткіпкол і ВСТСПШ зьявілася толькі 56 чалавек слухачоў з заводу «Бальшавік». Многія ячэйкі да гэтага часу дні партвучобы займаюць рознымі сходамі.

Некаторыя ячэйкі Кастрычніцкага раёну да гэтага часу нічога не зрабілі для адбору і пасылкі слухачоў у раённую першапачатковую школу і сав. партшколу. Пастановы раённай партканфэрэнцыі аб абавязковым ахопе партвучобай усіх членаў і кандыдатаў партыі і ня менш 50 проц. беспартыйных рабочых павінны быць выкананы. Услякай недаацэнцы партвучобы павінна быць абвешчана рашучая барацьба. Канкрэтных вінаватых у зрыве партвучобы трэба прыцягваць да адказнасьці.

ПАЛІЧАНСКІ.

Топчуцца на месцы

Камплектаваньне сеткі партыйнай і камсамольскай вучобы ў Барысаве пачата толькі ў канцы верасьня. Парт'ячэйкі фабрыкі «Рабочы», «Розы Люксембург», рабземлесу, мэдсанпрацы да гэтага часу нічога не зрабілі па арганізацыі партвучобы. У ячэйках ЦРК, гарсавету і сувязі разьмеркаваньне партыйцаў па школах і гурткох праведзена механічна, бяз уліку ступені іх палітычнага разьвіцьця.

На заводзе «Домбаль» прапагандысты тав. Жучко параняў адкласьці вучобу да часу ліквідацыі прарываў у прамфінпляне. Са 150 партыйцаў, 200 камсамольцаў і 900 беспартыйных рабочых, якія працуюць на гэтым заводзе, ахоплена партвучобай ня больш 100 чалавек. Такое становішча і на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна». З 2.500 чалавек (у тым ліку 260 партыйцаў) уцягнута ў вучобу толькі 382.

Барысаўскі райком партыі мала зварачае ўвагі на партыйную вучобу. Кіраўніцтва з боку РК партвучобай выявілася толькі ў... правядзеньні аднай нарады сакратароў вясковых ячэек, на якой была зачытана рэзалюцыя агульнага зьместу і больш нічога. Відома, што такім кіраўніцтвам партвучобы не паленішым.

ВЕДАЮЧЫ.

З бальшавіцкай непрымірымасьцю ачышчаць партыю ад кулацкіх агентаў

Ячэйкі і калектывы КП(б)Б вітаюць рашучыя меры барацьбы супроць правых апартуністых, двурушнікаў, здраднікаў партыі

Агульны сход парткалектыву заводу «Дрэвзапрацоўшчык» ухваліе пастанову ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з радоў партыі кулацкага агента-двурушніка Руціна. Сход надкрэсьлівае, што пастанова �цКК УсеКП(б) накіравана на захаваньне ленінскага адзінства партыі. Адначасова сход патрабуе ад лідэра правых — Бухарына спыніць сваё маўчаньне і даць выразны адказ — ці з партыяй і тады выконваць пастановы XVI зьезду УсеКП(б), ці ён застасьцца ў лагеры агентуры варожай нам клясы. Маўчаньне Бухарына сход разглядае, як мандэр правых апартуністых і чаканьне зручнага моманту для таго, каб зноў атакаваць генэральную лінію партыі. Сход патрабуе ад ЦКК гнаць з партыі ўсіх тых, хто ўхіляецца ад правядзеньня ў жыцьцё пастанову XVI зьезду. Партыйныя масы запэўніваюць бальшавіцкі ЦК партыі, што яны яшчэ больш павысяць бальшавіцкую пільнасьць і будуць бязьлітасна змагацца супроць правых і левых апартуністых за выразнае правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі!

* * *

Бюро парткалектыву менскай абутковай фабрыкі, заслухаўшы інфармацыю аб выключэньні з партыі правых апартуністых—агентаў кулацтва ў партыі—Руціна, Нусінскага і Караванскага канстатуе, што прэвыя апартуністы ня толькі не злажылі ідэйнай і арганізацыйнай зброі барацьбы супроць партыі, а наадварот, а такой-жа сілай, як і класавы ворат, актывізуюцца ў барацьбе супроць генэральнай лініі партыі, ужываючы сродкі ашуканства, двурушніцтва.

Бюро парткалектыву рашуча асуджае маўчаньне лідэраў з праваапартуністычнага літеру, цалкам і поўнасьцю ўхваліе рашучыя меры ЦКК у адносінах да правых апартуністых. Бюро парткалектыву патрабуе ад былых лідэраў, у прыватнасьці, ад ідэолёга правага апартунізму — Бухарына выразнага адказу: ці гатовы яны актыўна змагацца за генэральную лінію партыі супроць апартунізму, ці надалей думаюць прытрымлівацца сваіх праваапартуністычных поглядаў, якія прызналі XVI зьездам партыі несумяшчальнымі з прыналежнасьцю да УсеКП(б).

Парткалектыў запэўніе ЦК УсеКП(б), што ніякім праваапартуністычным элементам ня ўдасца парушыць адзінства бальшавіцкіх радоў і сарваць высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

За генэральную лінію партыі!

Супроць правых апартуністых і прымірэнцаў! За выкананьне баявога плану сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!

* * *

Агульны адкрыты сход яч. КП(б)Б пэдалёга-педагагічнага аддзяленьня пэдфаку БДУ цалкам і поўнасьцю ўхваліе пастанову ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з партыі кулацкага агента і двурушніка Руціна.

Партыйны сход катэгарычна патрабуе ад лідэра правых апартуністых — Бухарына спыніць сваё маўчаньне, выказаць сваё адносіны да пастанову XVI зьезду партыі і на справе давесьці сваю адданасьць генэральнай лініі партыі ў барацьбе супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі на даным этапе. У працўным выпадку партыйныя органы павінны пастаўіць пытаньне з усёй бальшавіцкай рашучасьцю аб яго прабываньні ў партыі.

Сход ячэйкі запэўніе ленінскае кіраўніцтва — ЦК УсеКП(б), што партыйная арганізацыя яшчэ больш згуртуе свае рады вакол генэральнай лініі партыі і навысьць сваю актыўнасьць у змаганьні за поўнае і няўхільнае выкананьне пастаноў XVI зьезду партыі!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Гнаць апартуністага!

Старшынёй праўленьня калгасу «КМІ» (Чырвона-Слабодзкі раён) працуе член партыі—Якубовіч. Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, у перыяд. калі калгас знаходзіўся ў арганізацыйным стане, у рабоце было шмат труднасьцяй. Якубовіч ня толькі не мабілізаваў мас калгаснікаў на перамогу гэтых труднасьцяй, а заўсёды сеяў паніку сярод калгаснікаў. Ён заўсёды крычаў: «нічога ня будзе, трэба калгас распусьціць, усёроўна ня справімся з работай». Гэты апартуністы ня бачыў таго энтузіязму ў масах, з якім яны змаганіся за гаспадарчае замацаваньне калгасу.

Весьнавую сяўбу калгаснікі выканалі з посьпехам. Наперакор інкрэньню правага апартуністага разваліць калгас, члены калектыву забіваліся ўсё новых і новых посьпехаў.

Будучы старшынёй калгасу Якубовіч сабатаваў выкананьне важнейшых партыйных дырэктыў, ён зусім ня цікавіўся ходам уборачнай кампаніі. Гэта давяло да таго, што два гэктары сенажаці засталіся нескошанымі, а частка аўса ня была ўбрана і прарасла на полі. Правы апартуністы, будучы кіраўніком калгасу, нічога не рабіў для арганізацыі працы ў калгасе, душыў самакрытыку, сарваў набудову сіласнай ямы.

У Чырвона-Слабодзкі райком партыі была падана калектыўная заява аб праваапартуністычнай практыцы Якубовіча. Але прайшло больш 3-х тыдня ў райком не рэагуе на гэтую заяву.

Мы патрабуем неадкладнага выканаўчэньня з радоў партыі апартуністага Якубовіча, які развальвае калгас, які груба ігнаруе выкананьне партыйных дырэктыў. Мы вядзіўлены, чаму Чырвона-Слабодзкі райком партыі да гэтага часу ня ўжыў мер у адносінах кулацкага агента ў партыі.

В. Фасько.

Усеагульнае навучаньне пад ударам

Фармалізм, закасьцянеласьць, апартуністычная стаўка на самацёк зрываюць усеагульнае навучаньне

Па-бальшавіцку змагацца за кожнага вучня

Патрэбен рашучы пералом

Друк па працягу некалькіх месяцаў амаль штодзень сыгналізуе аб значных прарывах у рабоце на правядзеньні ўсеагульнага навучаньня. Але патрэбнага пералому ўсё яшчэ няма.

Дзе-ні-дзе прафсаюзы, органы саветаў, партыйныя і камсамольскія арганізацыі застаюцца глухімі да нашых сыгналаў.

Сотні і тысячы дзяцей школьнага ўзросту застаюцца неахопленымі школамі. У радзе месц у вызначаныя тэрміны ня скончана будаўніцтва школ, адсутнічае неабходнае абсталяваньне і галоўнае што раённыя ўстановы марудзяць з перадачай пад школьныя будынкі кулацкіх дамоў. Усё гэта паглыбляе прарывы на фронце ўсеагульнага навучаньня.

У паасобных раёнах панае апартуністычная недаацэнка важнасьці культурнага будаўніцтва наогул і, у прыватнасьці, усеагульнага навучаньня. **Жлобінскі і Церахаўскі** райкомы партыі паказалі ўзор навольнасьці тэмпаў, чыста фармальнага падыходу да вырашэньня баявых задач і гэтым самым садзейнічалі апартуністычнаму самацёку замест рашучай барацьбы з ім. Гэтым-ж райкомы ня сталі на чале культпаходу, не арганізавалі мас на барацьбу за высокія тэмпы культурнага будаўніцтва.

Бясспрэчна, што пасьпяховае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня можа быць забясьпечана толькі пры рашучай непрымірымай барацьбе з апартуністычнай стаўкай на самацёк, з фармальнымі чыноўніцкімі адносінамі да вырашэньня задач культурнай рэвалюцыі.

Забясьпечыць школы памяшканьнямі, неабходным абсталяваньнем, забясьпечыць вучняў вопраткай і абуткам, змагацца за кожнага вучня—справа ня толькі органаў Наркамасьветы, але і ўсяе савецкае грамадзкасьці і ў першую чаргу баявая задача партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый.

Усеагульнае навучаньне і ліквідацыя няпісьменнасьці—адзін з найбольш баявых вучасткаў культурнай рэвалюцыі, барацьбы за пісьменную Савецкую Беларусь. Аб гэтым навінен памятаць кожны камуніст, камсамолец, ударнік сацыялістычнай будоўлі і ня толькі памятаць, але і змагацца за баявыя ўдарныя тэмпы па правядзеньні ўсеагульнага навучаньня.

У палоне апартунізму

Сотні дзяцей па-за школай

У Жлобінскім раёне панае апартуністычная недаацэнка палітычнай важнасьці ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці. Замест таго, каб мабілізаваць увагу ўсяе савецкае грамадзкасьці на выкананьне баявых задач па правядзеньні ўсеагульнага навучаньня, кіраўніцтва раёну бярэ стаўку выключна на самацёк.

Прафсаюзы навінны быць актыўным удзельнікам у ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі па культурным будаўніцтве, але яны літаральна ніякага ўдзелу ня прымаюць на правядзеньні ўсеагульнага навучаньня.

Школы гораду зусім не забясьпечаны інтэрнатамі і патрэбным абсталяваньнем. **Больш 100 дзяцей рабочых, батракоў і беднаты да сёнешняга дня застаюцца бяз прытулку, значная частка з іх зьбіраецца пакідаць навучаньне.**

Кіраўнікі спажывецкай і сельска-гаспадарчай кааперацыі катэгарычна адмовіліся забясьпечваць вучняў прадуктамі харчаваньня, вопраткай і абуткам.

Пастанова СНК аб перадачы кулацкіх дамоў пад школы ў раёне да гэтага часу ня выканана. Калгасаюз адмовіўся выканаць гэту пастанову ў сувязі з тым, што кулацкія дамы «перераданы калгасам». Становішча з будынкамі для школ катастрафічнае. Да кастрычніка ў раёне павінна было быць пабудавана 39 школ, з якіх «будуецца» толькі 5.

Раённы камітэт партыі, замест таго, каб прыцягнуць да суровай адказнасьці людзей, якія вінаваты ў зрыве будаўніцтва школ, замест забясьпячэньня пасьпяховага правядзеньня навучаньня году і ўсеагульнага навучаньня сваімі пастановамі вельмі часта спрыяе развалу работы па ўсеагульным навучаньні. Так, гэтымі днямі адзін з інтэрнатаў гарадзкой сямігодкі райкомам партыі забраны пад сваю канцылярыю.

На вёсцы зусім не разгорнута работа па ліквідацыі няпісьменнасьці і па праверкі работы аб усеагульным навучаньні. Брыгады і ўнаўнаважаныя, якія пасылаюцца рознымі раённымі арганізацыямі ў вёску, зусім не выкарыстоўваюцца для дапамогі школам і сельсаветам па [illegible] ўсеагульнага навучаньня.

Ніводная парт'ячэйка, сельсавет канкрэтна нічога не зрабілі па выкананьні дырэктыў партыі аб ліквідацыі няпісьменнасьці і аб забясьпячэньні пасьпяховага правядзеньня ўсеагульнага навучаньня. Сакратар райкому партыі ліквідаваў забясьпечваць вучняў прадуктамі і абуткам. Гэта ня ў ліку іншых фактаў, што «гаспадарчыя кампаніі важней за ўсеагульнае навучаньне», і як вынік такой палітычнай недаацэнкі культурнага будаўніцтва, у райкоме прытрымліваюцца погляду: «мы з гэтым пытаньнем яшчэ пасьпеем, дагаворымся з сакратарамі ячэек».

Усё гэта ставіць пад пагрозу зрыву правядзеньне ўсеагульнага навучаньня ў раёне. Мы патрабуем ад раённых устаноў Жлобіна неадкладнага ўзмацненьня кіраўніцтва і работы па культурным будаўніцтве

Ш. А.

Усеагульнае навучаньне ў Церахоўцы зрываецца

Церахаўскі райком партыі, райвыканком і іншыя раённыя арганізацыі яўна недаацэнілі палітычнага значэньня ўсеагульнага навучаньня, у сувязі з чым гэта работа засталася на задворках.

Больш **1.000 дзяцей школьнага ўзросту не ахоплены школамі,** з прычыны таго, што школы да вызначанага тэрміну не пабудаваны.

Пастанова СНК аб перадачы кулацкіх дамоў школам у раёне ня выканана. Райком і райвыканком упарта адмаўляюцца ад выкананьня гэтае пастановы, у сувязі з тым, што кулацкія дамы перераданы імі калгасам.

Значная колькасьць **дзяцей беднаты і батракоў** не паведзвае школы з-за адсутнасьці **вопраткі і абутку.** Кааперацыя літаральна нічога не зрабіла, каб забясьпечыць вучняў патрэбнымі рэчамі.

Яшчэ горшае становішча ў раёне з ліквідацыяй няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Да гэтага часу на сельсаветах ня складзены пляны па ліквідацыі няпісьменнасьці, не хапае кадраў ліквідатараў, школьных будынкаў і патрэбнага абсталяваньня. Паводле прыблізных падлікаў, ліквпунктамі не ахоплена **773 чалавекі** няпісьменнага насельніцтва.

Партыйная, камсамольская і савецкая грамадзкасьць не мабілізавана на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб усеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці. Ні адна парт'ячэйка пытаньнямі культурнага будаўніцтва не займалася.

Мы лічым, што партыйны камітэт павінен неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі ў пытаньнях культурнага будаўніцтва, мабілізаваць усю партарганізацыю на ліквідацыю прарываў ва ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці.

ГЕРШМАН.

Глухія да сыгналаў

Як і наколькі ахоплены школамі дзеці 8-10 гадовага ўзросту, у **Попацкім** раёне ніхто ня ведае. Камісіі па ўсеагульным навучаньні як у раёне, так і ў сельсаветах бязьдзейнічаюць. Яны нават не зрабілі повераў як ажыцьцяўляецца дырэктыва партыі і ўраду аб усеагульным навучаньні.

У радзе месц не закончана будаўніцтва школ. Ёсьць простая пагроза, што школы наогул да зімы пабудаваны ня будуць

Раённыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб правесьці ўлік дзяцей беднаты і батракоў, з-за адсутнасьці якога немагчыма выстарчальнае забясьпячэньне гэтых груп вучняў абуткам і вопраткай.

Камітэты сацыяльнасьці, якія існуюць пры школах, нічога не зрабілі, каб адшукаць у грамадзкім парадку сродкі для забясьпячэньня дзяцей беднаты і батракоў. Наогул, вакол пытаньняў усеагульнага навучаньня не мабілізавана ў патрэбнай ступені думка савецкай грамадзкасьці. Камсамолы, які павінен быць застрэльшчыкам у выкананьні гэтай баявой задачы, вусім не разгарнуў работы па мабілізацыі мас моладзі на барацьбу за ўсеагульнае навучаньне. Ні адно мерапрыемства ў гэтым напрамку камсамолам не падхоплена.

П.

Ганебныя тэмпы

Рад школ **Шклоўскага раёну** да гэтага часу яшчэ не распачаў заняткаў. Інспэктарыят асьветы ня ведае, у якім стане знаходзяцца школы.

Школы ня могуць пачаць заняткаў з адсутнасьці памяшканьняў. Так, напрыклад **Лакуцянскай** школы будзе закончана, мяркуючы па тэмпах будаўніцтва, не раней чым праз год.

Пастаўнікі, накіраваныя Наркамасьветы для работы ў Шклоўскі раён, тыднямі бадзяюцца па вуліцах Шклова, у той час, як у раёне зрываецца ўсеагульнае навучаньне.

Работнікі [illegible] раённых арганізацый [illegible] пытаньнях усеагульнага навучаньня прытрымліваюцца [illegible] дзяцей беднаты, батракоў і нап[illegible] ня ахоплены школамі. Зрыў [illegible] ліквідацыі няпісьменнасьці.

[illegible] відаць, шклоўскія кіраўнікі лічаць, што работа па ўсеагульным навучаньні не зьяўляецца баявой, адказнай работай.

Людзі, якія ігнаруюць выкананьне дырэктыў партыі, павінны атрымаць па заслугах.

М.

Злачынная бязьдзейнасьць

На заводзе «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» да сёнешняга дня яшчэ не распачата работа па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Заўком упарта адмаўляецца правесьці ўлік няпісьменных і малапісьменных рабочых. САКРАТАР ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ адмовіўся вызначыць прадстаўнікоў заводу ў штаб культпаходу, матывуючы тым, што з гэтага «УСЕРОЎНА НІЧОГА НЯ ВЫЙДЗЕ».

На фабрыцы МЕНШВЭЙ ІМЯ В САКА кіраўнікі імкнуцца змазаць палітычную сутнасьць ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Ня лепш з работай па ліквідацыі няпісьменнасьці і НА ЗЭЛЬВОДЗЕ, ФАБРЫЦЫ «БЕЛАРУСКА» і ў групе ЖАКТАЎ КАМАРОЎСКАГА ВУЧАСТКУ. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі на гэтых прадпрыемствах літаральна нічога не зрабілі, каб выканаць балвы загад партыі аб пагалоўнай ліквідацыі няпісьменнасьці.

ЗАГ.

Нацыянал-дэмакратызм у навуцы

КУДЫ ВЯЛА НАВУКУ ТЭОРЫЯ САМАБЫТНАСЬЦІ

Мы бачылі, што ўся работа Акадэміі мела перад сабой адну ўстаноўку—тэорыю самабытнасьці. Самабытнасьць у лінгвістыцы, самабытнасьць у літаратуры, самабытнасьць у этнаграфіі і гісторыі, самабытнасьць у антраналёгіі.

Але было-б памылкова думаць, што тэорыя самабытнасьці зьяўляецца ўжо апошняй інстанцыяй. Апошняя інстанцыя ляжыць тут не ў абсягу тэорыі, а ў абсягу палітыкі. У шалёных атаках клясавага ворага супроць дыктатуры пралетарыяту—вось дае трэба шукаць унутраны мэханізм гэтай тэорыі. За плятформай «навукоўай» ляжыць плятформа палітычная, плятформа нацыянал - дэмакратызму, буржуазнай рэстаўрацыі. Вось як т. Сталін характарызуе імкненьне да «самабытнасьці», да нацыянальнага замыканьня. «Сутнасьць уходу да мясцовага нацыяналізму,—кажа тав. Сталін у сваім дакладзе на XVI партзьезьдзе,—заключаецца ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай лускі, у імкненьні затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры сваёй нацыі, у імкненьні абараніцца ад вялікарасійскага шавінізму шляхам адыходу ад патоку сацыялістычнага будаўніцтва, у імкненьні ня бачыць таго, што зьліяе і злучае працоўныя масы нацыянальнасьцяй СССР, а бачыць толькі тое, што можа іх аддзяліць».

«Не бясьпечна гэтага ўхілу,—гаворыць далей тав. Сталін,—заключаецца ў тым, што ён культывуе буржуазны нацыяналізм, паслабляе адзінства працоўных народаў СССР і грае на руку інтэрвэнцыяністым».

Тав. Сталін дае тут характарыстыку ўхілу да мясцовага нацыяналізму. У даным-жа выпадку, калі мы гаворым аб фабрыкацыі і «фабрыкантах» тэорыі самабытнасьці ў «працах» БАН—гутарка ідзе ўжо не аб ухіле да мясцовага нацыяналізму, а аб самым нацыяналізме. Тут гутарка ідзе не аб «ухіле», а аб яўна выяўленым нацыянал-дэмакратызме. І калі адно імкненьне да нацыянальнае абасобленасьці, імкненьне да таго, каб «замкнуцца ў сваёй нацыянальнай лусцы» гра на руку інтэрвэнцыяністым—дык што-ж мы павінны сказаць, калі гэта імкненьне даведзена да свайго завяршэньня? Перад намі тады такая ідэалёгія, якая ня толькі грае на руку інтэрвэнцыяністым, але якая сама непасрэдна зьяўляецца ідэалёгіяй інтэрвэнцыяністых.

Мы тут маем перад сабой непасрэднае выяўленьне нацыянал-дэмакратычнай палітыкі. Тэорыя «самабытнасьці» была сьвядомай зброяй у руках «сьвядомых» палітыкаў клясавага ворага, каб падрыхтаваць глебу да іх палітычных «ідэалаў»—да буржуазнай рэстаўрацыі.

Гропы ня пахнуць,—гаварыў Маркс. Але ад тых грошай, у імя якіх фабрыкавалася тэорыя самабытнасьці, здорава патыхае. Патыхае ад іх ветрам «заходнім», смуродам фашызму.

Мы бярэм, напрыклад, такую «нявінную» справу, як этнаграфія. «Тэарытычная» ўстаноўка гэтай катэдры ясная: мы там на апойдзем ніводнага слова аб быце працоўных Беларусі. Калі вы хочаце ведаць, як жыве беларускі рабочы і селянін—ня шукайце гэтага ў працах катэдры этнаграфіі БАН. Вы гэтага ўсё роўна ня знойдзеце. Адзінае, што вы можаце там «вывучыць»—гэта як лаяцца смачна і сакавіта на ісьціннa-беларускай мове, каб ваша лаянка сапраўды адказвала-б ісьціннa-«беларускаму духу». Вы можаце яшчэ—крый божа — матам вылаяць. Не рабеце гэтага, бо... бо гэта не ў беларускім «народным» стылі. Катэдра этнаграфіі дае поўную калекцыю з неабмежаваным асартыментам на гэтай частцы. Вось некалькі «пэрлаў» з гэтае калекцыі: «Адсохні табе язык, трасца табе ў губу, праніцы табе ў нос, сабачы твае вочы, каб ты акалеў» і г. д., і г. д. Усяго 250 зваротаў лаянкі (працы катэдры этнаграфіі т. І). Вось што значыць лаяцца па-«народнаму»...

У «работах» катэдры этнаграфіі мы таксама знаходзім найтыпавейшы досьледы, адкуль яшчэ пашла беларуская рубаха, слуцкі пояс, вышыўка на ручніках і падобныя «животрепещущие» пытаньні. Катэдра этнаграфіі ўсімі сіламі старалася стварыць цэлы культ вакол гэтага пояса і ручніка, вакол нацыянальнага, «ісьціннa-беларускага» ўбраньня. Падобна таму, як баі, мулы на Ўсходзе жорстка праследуюць тых, хто зьвяжае сьвятую чадру, пюрбан, фэску, падобна таму, як яўрэйскія клерыкалы «метали громы и молнии» супроць таго, хто апраецца, як «презренный той», адракаючыся ад сьвятой капоты і лапсардаку —падобна гэтаму катэдра этнаграфіі стаяла на варце «беларускага» пояса, «беларускай» рубахі і г. д.

Але ўсё гэта «тэорыя»—дзе-ж тут палітыка? Яна ёсьць. Паперчае, «беларускі пояс» навінен служыць сымбалам сьвятыні для ўсіх беларусоў. Тут ужо ад клясах дазвольце не гаварыць. Адзіны нацыянальны фронт супроць клясавага фронту пралетарыяту.

Нацыянальнае ўбраньне—гэта яшчэ адна абарона супроць «шкодных» ручэньняў аб клясавым змаганьні, аб сакаве ўсіх працоўных.

Расказваюць, што калі ў часе царызму ў Лодзі была аблава на рэвалюцыянэраў, лодзінскі рабін даў добрую параду паліцмэйстару: «Абшукайце—скажу сьвяты рэбэ»,—усіх яўрэйскіх маладых людзей. У кагосьці аказуцца «цыцэс», тых адпусьціце, а ў кагосьці ня будзе—пасадзіце ў «кутузку». Калі ён бунтуе супроць веры і «свайго» нацыянальнага адзеньня—значыцца ён бунтаўшчык супроць цара і прастолу». Лодзінскі рабін і паліцмэйстар далі дасканалы вурок, якавы клясавы зьмест культывавання нацыянальнага ўбраньня. Кіраўнікі катэдры этнаграфіі БАН гэты вурок дасканала засвоілі і ўжывалі.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Этнаграфія ў руках нацдэмаў стала сродкам для насаджэньня непасрэднай палітычнай установкі, непасрэдных інтэрвэнцыяністых поглядаў.

У гэтым-жа зборніку мы знаходзім адзін—здавалася-б—нудненькі артыкул, біяграфію аднаго этнографа. Здавалася-б, што тут-та нашэўна нічога «такога» быць ня можа. Але ў гэтым нудненьким абрамленьні (для адводу вачэй — відавочна) укроплена адна мысьль—гвоздь усяго артыкулу, а імянна: Смаленская губэрнія этнаграфічна зьяўляецца часткай Беларусі. Аўтар пералічвае 7 «беларускіх» паветаў у Смаленскай губ., у тым ліку і Смаленск.

Установка тут ясная: этнаграфічна Смаленская губэрнія—частка Беларусі, але палітычна яна складае сабою частку РСФСР. Значыцца, частка Беларусі «захоплена» маскалямі, «акупавана Масквой»... Азбукін, географ ад нацыянал-дэмакратызму, адкрыў ужо ісьціну, што Беларусь складаецца з трох частак: польская частка, СССР і трэцяя частка Беларусі, якая знаходзіцца пад «уладарствам Масковіі». Этнограф Шлюбсы «падцьвярджае» гэтую ісьціну ад імя этнаграфічнай навукі.

Але такія «ісьціны» ня можна толькі канстатаваць. Гэта ўжо ня «сума поглядаў», а плятформа дзеяньняў. Калі РСФСР—акупант Беларусі, дык практычная лінія, лінія дзеяньняў напрашаецца сама сабой. Трэба змагацца з «гвалтаўшчыкамі - акупантамі», трэба «вызваліць» Беларусь ад «маскоўскага ярма», словам, трэба перайсьці ад поглядаў да контр-рэвалюцыйных дзеяньняў.

Ідэалёгі беларускай буржуазіі, беларускага кулацтва, фактычна высоўваюць гэтым пытаньне аб «вызваленьні» Беларусі ад савецкае ўлады, «вызваленьні» рабочых ад іх фабрык і заводаў, «вызваленьні» сялян ад іх зямлі.

Тэорыя самабытнасьці Беларусі завострана з аднаго канца. Выкненьне «бачыць толькі тое, што можа адрозніць»—гэта імкненьне дасягае сваёй найбольшай вышыні, калі гутарка ідзе аб СССР, калі гутарка ідзе аб саюзе з рабочымі і сялянамі іншых нацыянальнасьцяй. У гэтым выпадку нацыянал-дэмакратычная навука дае цэлую кучу доказаў аб самабытнасьці беларускага «народу», аб яго нацыянальных асаблівасьцях, у сувязі з чым ён «натуральна» навінен імкнуцца да абасобленага палітычнага існаваньня.

Але куды дзяецца гэтая самабытнасьць, калі нацыянал-дэмакраты ўсіраюцца на «міны» захад, на дзарагі для іх сэрца—польскі фашызм? Тут самабытнасьць зьнікае. Яна замяняецца, наадварот, гутаркамі аб духоўнай блізкасьці паміж беларускай і польскай культурамі, аб супольнасьці іх гістарычнага шляху і г. д. і г. д.

З беларускае мовы старанна выкарчоўваецца ўсё тое, што нагадвае собаю хаця-б далёкае падабенства да расійскай мовы.

БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛЯН

ЗАВОД БРАКУ

Крывая вытворчасьці на „Чырвоным Мэталісьце" ганебна спаўзае ўніз

ЗАМЕСТ 4500 ПЛУГОЎ ВЫПУШЧАНА... ТОЛЬКІ 2.—50 ПРОЦ. БРАКУ У ПЛУЖНЫМ, ТАКАРНЫМ І ЛІЦЕЙНЫМ ЦЭХАХ

Кіраўніцтва заводу павінна быць аздароўлена і ўмацавана

За апошні час у цэнтральным друку («Зьвязда», «Рабочая») і ў «Віцебскім Пралетары» віцебскія рабкоры сыгналізавалі аб пагрозе зрыву прамфінплану на заводзе «Чырвоны Мэталісты». Ня гледячы на папярэджаньні друку, крывая вытворчасьці заводу спаўзае ўніз. На ўсіх пэхах выкананьне прамфінпляну зрываецца.

ПЛУЖНЫ ЦЭХ ФАКТЫЧНА СПЫНІЎ РАБОТУ

Плужны цэх на сёньняшні дзень замест 4.500 плугоў выпусьціў толькі два. Фактычна цэх спыніў работу. 75 проц. рабочых перакінуты ў іншыя цэхі. Рэшта займаецца вырабам дэталяў для плугоў «ДЛРМ».

З прычыны адсутнасьці чарнажоў і шаблёнаў, пры вырабе дэталяў атрымоўваецца шмат браку. Арыгінал плугу «ДЛРМ» прыбыў на завод яшчэ ў маі месяцы. Рабочыя і прыёмшчыкі ня раз патрабавалі, каб адміністрацыя накланалася загатоўць чарнажы і шаблёны для дэталяў. Але дарэмна. Уся работа робіцца «на вока». У рэзультаце вялізарная колькасьць браку. Напрыклад, выраблена 2.000 колаў, з якіх 800 ужо забракаваны, бо ў іх аказаўся кароткія сьпіцы. Забракаваны таксама кучы рам і сотні лінеек.

Стойкі для плугоў на спэцыфікацыі павінны быць жалезнымі. Адміністрацыя-ж, без папярэдніх іспытаў і ўсялякіх тэхнічных падстаў, пачала выраблять стойкі з чыгуну. Ужо выраблена каля 2.000 стоек. Рабочыя зараз бьюць трывогу, што стойкі няпрыгодны і пятрывалы. На заўвагі рабочых адміністрацыя адказвае: «Плугі паслалі на іспыты. Праз 2-3 тыдні будзем ведаць».

А што, калі чыгунныя стойкі ды іншыя дэталі аказ'уцца непрыгоднымі? Тады ўся работа заводу на працягу 20 дзён будзе дарэмнай. Тысячы дэталяў будуць выкінуты.

Увесь час завод працуе ўсьляпую. Яшчэ да пачатку ўдарнага кварталу нельга было зрабіць патрэбныя іспыты з плугам, падрыхтаваць чарнажы дэталяў і шаблёны. Адміністрацыя прычыны прарываў тлумачыць недахопам жалеза. Аб забесьпячэньні жалезам адміністрацыя своячасова не падумала.

Але нават, калі-б жалеза і было, ці зможа завод пры сучасным сваім становішчы прадаваць без перабояў і ліквідаваць ганебны прарыў? На гэтае запытаньне прыходзіцца даць адмоўны адказ.

КАТАСТРАФІЧНЫ РОСТ БРАКУ

Для выпуску плугоў «ДЛРМ» плужнаму цэху кожны дзень патрэбна 500 стоек. Але з прычыны бескаспадарчасьці ў ліцейным цэху, апошні вырабляе толькі 180 стоек. Для выпуску плугоў патрэбны штампы, а іх няма. Рабочыя інструманталышчыкі ня могуць вырасьліць штампаў без чарнажоў і тэхнічных выпісэньняў.

У кавальскім цэху бязьдзейнічаюць паветраныя молаты, бо адміністрацыя не пакланацілася замяніць маторы перамешчанага току, у сувязі з пераходам заводу на пастаянны ток.

На заводзе не хапае агнятрывалай цэглы для рамонту пячэй у кавальскім цэху. Гэта пагражае астаноўкай ня толькі кавальскага цэху, але і ўсяго заводу, бо серца заводу — ліцейны цэх, патрабуе кожны дзень цэглы для аблiцоўкі вагранкі.

Важнейшы цэх—такарны, выканаў праграму ўсяго ў разьмеры 40 проц. З прычыны агіднейшай пастаноўкі работы 7-8 варштатаў такарнага цэху кожны дзень ідуць у рамонт. Рамонт-жа робіцца несвачасова, бо адміністрацыя не пакланацілася забясьпечыць такарны цэх спэцыяльнай брыгадай сьлесароў для рамонтных работ. Варштаты ў запушчаным становішчы. Сярод рабочых цэху наглядаецца рвацтва, прагулы дасягаюць пагражаючых разьмераў.

Ня лепш справа і ў сьлясарна-зборачным цэху. З прычыны таго, што цэх працуе ўсьляпую, «на вока», частка лябёдак пры зборцы прыходзіцца падганяць. Робіць гэта самым барбарскім чынам. Напрыклад, шасьцярэньку падганяюць ударамі 2-х пудовага молата на валёку. Якасьць лябёдкі, зразумела, рэзка зьніжаецца. Часьці адной лябёдкі не падыходзіць да другой. У рэзультаце замест масавай вытворчасьці атрымліваецца грубае саматужніцтва.

На ўсім заводзе катастрафічна расьце брак. У такарным цэху брак дасягае 50-60 проц. У ліцейным—50 проц. Тое-ж самае ў мэханічна-плужным.

Да ўсяго трэба яшчэ дадаць шкодніцкую работу кантрольнага апарату заводу. Замест таго, каб забракаваць пауфабрыкат у першай стадыі яго вырабу — бракуюць ужо гатовыя вырабы. Так некаторыя лябёдкі забракаваны з-за недобраякаснасьці паасобных частак.

КІРАЎНІЦТВА НЯЗДОЛЬНА МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ

У гэтыя крытычныя дні кіраўніцтва заводу пакінула яго на волю лёсу. Дырэктар Барговін і загадчык вытворчасьцю—Крыгель абодвы паехалі на курорт. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі заводу зьмяніліся і няздольны ўзьняць масу рабочых на ліквідацыю прарываў і перамогчы труднасьці. На заводзе ня быў арганізаваны ні адзін сход, каб завастрыць увагу рабочых вакол прарыву.

Рабочая маса вельмі бурна рэагавала на адозву ўдарнікаў заводу «Камунар». Але кіраўніцтва няздольна было арганізаваць масу вакол гэтай адозвы.

Камсамольскі калектыў таксама нічога ня робіць. Многія камсамольцы ня ведаюць у хвасьце самай адсталай масы рабочых.

Творчая ініцыятыва рабочых прыдушана. Аб гэтым сьведчыць той факт, што ў адным толькі плужным цэху 27 каштоўных рабочых прапаноў марыцца ня працягу амаль цэлага году.

Ганебная плана з Прамфінпляндарнага беларускага Пуцілаўца можа быць выта толькі пры нездальнай перабудове работы усяго адміністрацыйна-тэхнічнага апарату заводу.

Кіраўніцтва «Чырвонага Мэталістага» павінна быць аздароўлена і ўмацавана.

Сваімі ўласнымі сіламі завод зараз гэтага зрабіць ня можа. Яму патрэбна тэрміновая дапамога.

Г. ПРАКАПОВІЧ і С. ДЖАЛЮК.

***

Рэдакцыя газ. «Рабочай» пастанавіла ўзяць завод «Чырвоны Мэталісты» на грамадзкі буксір. У Віцебск выяжджае выязная рэдакцыя газэты «Рабочай».

Вітаючы гэты пачын, мы спадзяемся, што газ. «Рабочай» дапаможа «Чырвоному Мэталістаму» ў найбольш кароткі тэрмін ліквідаваць усе ненармальнасьці ў рабоце заводу.

Работніцы менскай абутковай фабрыкі—Шустад і Гольтблат, лепшыя ўдарніцы, атрымаўшыя прэмію.

Барацьба за перамогу

Вытворчыя манэўры на заводзе «Энэргія» ўступілі ў рашаючую фазу свайго разьвіцьця. Увесь калектыў рабочых заводу рапучна вядзе барацьбу за перамогу, за сьцяг ЦК КП(б)Б.

Такарны цэх усё яшчэ наступае

Такарны цэх, які доўгі час ліцыўся вузкім месцам заводу, трымае ў сваіх руках ініцыятыву наступленьня. За апошні дні створаны 4 вытворчыя камуны імя трэцяга году пяцігодкі.

З-за адсутнасьці падносьнікаў матар'ялу да варштатаў, апошнія раней у середнім прастойвалі штодзенна на 15-20 хвілін. Ніхто не дадумаўся пастаўіць гэтых людзей. Толькі цяпер, па загаданьні цэхштабу, пастаўлены два спэцыяльных падносьніка матар'ялу да варштатаў.

Цэхштаб і бюро цэх'ячэйкі пастанавілі ўзяць на буксір ліцейны цэх.

Ліцейны цэх перашкаджае такарнаму з посьпехам рушыцца наперад. Вось чаму, на якіх ліцейных цэх бярэцца на буксір: 1) растлумачэньне ўмоў конкурсу; 2) ачышчэньне браку; 3) своячасовая загатоўка дэталяў для варштатаў; 4) ачышчэньне чаргі ў сталоўцы.

Справа ў тым, што за апошні час ліцейны цэх нядобрасумленна адносіцца да сваёй работы: бракаваны матар'ял адстрам перакідваецца ў такарны цэх, з-за чаго там бываюць прастоі.

З-за недавыпрацоўкі дэталяў гатовая прадукцыя стаіць на некалькі дзён у пэхах, займае месца і перашкаджае працаваць. Напрыклад, 20 зробленых на заводзе сьвідравальных варштатаў сталі цэлы дзень і чакалі дробных дэталяў, якія забылі зрабіць у ліцейным цэху.

Такарны цэх ужо дабіўся значных посьпехаў на звышчасовай чарзе ў сталоўцы. Такарны цэх абедае 15-20 хвілін.

Ліцейны цэх таксама пачаў падцягвацца. Рабочымі ліцейнага цэху падана ў прапанову на заключэньні каллягавору. Рабочыя прапануюць уключыць у каллягавор спэцыяльны пункт аб тым, што ўсе рабочыя заводу павінны самаатрэтаваецца да канца пяцігодкі.

Капельнаму цэху трэба рапуча ліквідаваць непаладкі

Штаб капельнага цэху выявіў рад адных фактаў, якія трэба зараз-жа ліквідаваць. Кавалкі каштоўнага матар'ялу і жалеза раскіданы на ўсім цэху і ляжаць на дварэ. Каштоўныя інструманты (электрычныя бор-машыны) кідаюцца на двор. З-за нядбайнасьці загадчыка складу, штодзённа зьнікаюць каштоўныя матар'ялы і інструманты.

Цэхавая насьценгазэта валяецца ў пылі, а рэдкалегія абяцае калі-небудзь напісаць аб манэўрах.

Праўда, за апошнія дні цэх'ячэйка і цэхштаб узварушыліся: створаны тры вытворчыя камуны, у адну з іх запісаліся 70 рабочых. Аднак, заводкі камітэт да гэтага часу не мабілізаваў грамадкай думкі вакол гэтых камун, каб рабочых паваг і ня ведаюць аб іх.

Ня прагульшчыкаў—чорная каса

На агульна заводскім сходзе рабочыя станавілі ў мэтах барацьбы з прагульшчыкамі—прагульшчыкам выдаваць пэнсію ў апошнюю чаргу, а злосным прагульшчыкам выдаваць пэнсію ў «чорнай касе». За апошнія дні заўважаецца, што ў сувязі з гэтай пастановай зьнізілася колькасьць прагульшчыкаў.

„Хвасты"—па віне Белмэталяаб'яднаньня

Завод выканаў за дзве дэкады кастрычніка 60 проц. месячнага плану. У гэту лічбу не ўваходзіць незакончаная прадукцыя і «хвасты».

«Хвасты»—зьвышплановая нагрузка заводу. Вельмі часта рабочаму замест выкананьня яго прамфінпляну даюць выпрацоўваць дэталі, якія зусім ня маюць ніякіх адносін да прамфінпляну (рамонт і г. д.). Гэта бязумоўна перашкаджае і дэзарганізуе выкананьне рабочым яго штодзённага прамфінпляну.

Белмэталяабяднаньню трэба пазбавіць завод ад вырыватай працы, якая ня мае адносін да непасрэднай работы —машынабудаўніцтва—заводу.

МАЦЬВЕЙ ФАРБЭРАЎ.

„Арытмэтычныя памылкі" бухгальтэрыі скарняжнай фабрыкі

Ужо больш 2-х месяцаў, як у бухгальтэрыі скарняжнай фабрыкі (Менск) панує поўная неразьбярыха. Рабочыя не заўсёды атрымліваюць поўнасьцю належачую ім зарплату з прычыны «арытмэтычных памылак» пры разьліках. Вось прыклады.

Рабочыя Глезэр, Бойтух і Ячня за два тыдні выпрацавалі кожны каля 70-80 руб. Але пры выплаце пэнсіі атрымалі усяго адзін па 10 руб. і двое па 5 руб. Калі нездаволеныя рабочыя пайшлі ў бухгальтэрыю, каб ім растлумачылі, галоўны бухгальтар Тангураў іх вынаў. Фабком для высьвятленьня справы паслаў брыгаду, але суправоўніца бухгальтэрыі Вакскнкруг абазвала рабочых «мальчишками».

Бухгальтар Гавіровік, нарабіўшы шмат памылак, каб ухіліцца ад адказнасьці, перайшоў працаваць у іншую савецкую установу.

Адміністрацыя ведае пра ўсе гэтыя непарадкі ў бухгальтэрыі, але ня ўжывае ніякіх мер, каб іх зьнішчыць.

ЛУР'Е.

Не здаваць пазыцый!

Гомельская швейная фабрыка «Камінтэрн» да тэрміну выканала прамфінплян другога году пяцігодкі. Але лічбы за першую дэкаду кастрычніка гавораць аб тым, што рабочы калектыў фабрыкі ня здолеў замацаваць перамогу, дасягнутую ў рэзультаце 10-дзённых вытворчых манэўраў. За першую дэкаду па піджачным цэху выраблена 75,1 проц. пляну, па бручча-анцельскаму—91 проц. і па пашагнаму—79,8 проц.

На пашыраным пленуме фабкому разам з тэхпэрсаналам выявілася, што прычынай прарыву зьяўляецца нераспарадчасьць і нездольнасьць цэхавай адміністрацыі,вялікі лік прастояў і адсутнасьць паасобных рабочых. Аб становішчы на фабрыцы своячасова было паведамлена на тэлеграфу рэдакцыі газ. «Акцябр» з просьбай выслаць брыгаду. Але рэдакцыя чамусьці не сьпяшаецца.

Паказальнікі работы фабрыкі за першую дэкаду кастрычніка вымагаюць ад усіх арганізацый заводу і ўдарнікаў намагчы ўсе сілы на ліквідацыю прарыву, каб зноў стаць у першыя рады барацьбітоў за прамфінплян.

Д. Невельская.

Магвалакнабуд—пусьціць да 13-ай гадавіны кастрычніка

МАГІЛЕЎ. 15 КАСТРЫЧНІКА РАБОЧЫЯ-СПЭЦЫЯЛІСТЫЯ МАГВАЛАКНАБУДУ ЎСТУПЛІ Ў 22-ХДЗЕННЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ ПАД ЛЁЗУНГАМ ПУСКУ ФАБРЫКІ Ў ДЗЕНЬ XIII ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

НА РАБОЧЫХ СХОДАХ З УДЗЕЛАМ СПЭЦЫЯЛІСТЫЯ АБРАНЫ ШТАБ МАНЭЎРАЎ, РАСПРАЦАВАНЫ АПЭРАЦЫЙНЫ ПЛЯН, ЯКІ ДАВЕДЗЕНЫ ДА ПААСОБНЫХ БРЫГАД І ГРУП РАБОЧЫХ. ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б ПА ДАКЛАДУ ПРАДСТАЎНІКОЎ МАГВАЛАКНАБУДУ ПАПУЛЯРЫЗАВАНА СЯРОД РАБОЧЫХ І СПЭЦЫЯЛІСТЫЯЎ.

САКРАТАР ПАРТКАЛЕКТЫВУ—ГУНДЗІК.
НАЧАЛЬНІК МАГВАЛАКНАБУДУ—ВАРАБ'ЕЎ.
СТАРШЫНЯ ФАБКОМУ—ТОЛСТЫХ.

Вывезьці лён з поля

Калегія НКЗ абмеркавала пытаньне аб становішчы з уборкай ільну і кавапель і аб першапачатковай апрацоўцы ільняной і канапляной саломы.

Калегія адзначыла, што ільнаканапляводсаюз мала ўвагі зварачае на пытаньні першапачатковай апрацоўкі ільну і кавапель. Плян набудовы пунктаў па першапачатковай апрацоўцы і мачыльных ям ня выкананы.

У саўгасах ільнапяньковага аб'яднаньня і ў калгасах ня ўвесь выцераблены лён вывезены з поля.

Калегія НКЗ прапанавала ільняпяньковаму аб'яднаньню ВСНГБ скончыць у бліжэйшы тэрмін возку з поля і абмалот ільну і канапель.

Райзямаддзелам, Райкалгасасюзам і раённым ільнаканапляводсаюзам даручана склаць рабочы плян першапачатковай апрацоўкі ільну.

Ільнапяньковаму аб'яднаньню ВСНГБ прапанавана недкладна прыняць закантрактаваную салому на заводы па першапачатковай апрацоўцы. Калегія звярнулася да пракурора рэспублікі з просьбай прыцягнуць да адказнасьці Ільнаканапляводсаюз за срыў пляну набудовы першапачатковых пунктаў і мачыльных ям.

ЗЬВЯЗДА

ТЭКСТЫЛЬНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЧАКАЕ ІЛЬНУ

ТЭМПЫ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ГАНЕБНЫЯ: ЗА 20 ДЗЁН КАСТРЫЧНІКА ЗАГАТОЎЛЕНА 24 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ПЛЯНУ

Купакі сабатуюць здачу ільну.—На мясцох няма кантролю за выкананьнем цьвёрдых заданьняў

Загатоўчы апарат—у баявую гатоўнасьць!

Кампанія загатовак ільну і пяньки 1930-31 году па сваім аб'ёме, характары, гаспадарча-палітычным значэньні ва многім адрозьніваецца ад загатоўчых кампаній мінулых год.

Рост удзельнае вагі калгаснага сэктару, арганізацыя сартовачна-размеркавальных баз «Ільнапяньканпрому», кредытная раформа, якая дэцэнтралізуе кредыты і разьлікі па загатоўчых апэрацыях, зьяўляюцца асноўнымі асаблівасьцямі новай кампаніі.

У новых абставінах, якія склаліся на вёсцы, старыя формы і мэтады загатовак, як работа на рынку праз прасолаў, канкурэнцыя і г.д., бязумоўна ня ўжытны.

Патрэбны новыя мэтады работы каапэрацыйнага і загатоўчага апарату.

Павышэньне якасьці ўсёй работы, ператварэньне загатовак у грамадзка-палітычную кампанію, рашучая барацьба са скажэньнямі клясавай лініі, апартуністычнай практыкай у загатоўках, курсам на самацёк, з ныцьцём аб надмерных плянах—зьяўляюцца асноўнымі патрабаваньнямі да ўсіх загатоўчых органаў.

Дырэктыва XVI партзьезду: **«побач з усямерным разьвіцьцём цяжкай прамысловасьці, як асноўнай базы сацыялістычнага будаўніцтва, узмацніць разьвіцьцё лёгкай індустрыі і яе сыр-цовай базы»**—навіна легчы ў аснову ўсёй работы на загатоўках ільну і канапель.

Аддаючы выключную ўвагу ахопу загатоўкамі калгаснага сэктару, трэба палепшыць **абслугоўваньне індывідуальнага сэктару**, які ў плане загатовак займае вельмі важнае месца.

Асаблівую ўвагу пры загатоўках трэба зьвярнуць своячасоваму і поўнаму збору закантрактаванай прадукцыі, праводзячы шырокую кампанію за яе датэрміновую здачу. Трэба прадугледзець своячасовы завоз у ільнаводныя раёны адпаведнай колькасьці і асартыманту прамтавараў і хлеба.

Дагэтуль загатоўчыя арганізацыі яшчэ не падрыхтаваліся да надыходзячай кампаніі. Загатоўчы апарат с.-г. і спажывецкай каапэрацыі яшчэ не перабудаваў сваёй работы. Наглядаецца адарванасьць цэнтральнага апарату ад ізоўкі. Работа пакуль што ідзе самацёкам. Пляпавыя заданьні па загатоўках ільну і канапель не даведзены да вёскі і калгасу, ня даны яшчэ цьвёрдыя заданьні кулацкаазможным гаспадаркам.

У бліжэйшыя дні трэба прывесьці загатоўчы апарат у баявую гатоўнасьць.

МАРТЫНАЎ.

(Упаўнаважаны НКЗ СССР і галоўлёнкому па БССР).

ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ—АДСТАЛЫ ВУЧАСТАК

Паводле вестак аб ходзе загатовак ільна-насеньня па сыстэме ільнаканапляводнай каапэрацыі, на 20-га кастрычніка месячны плян загатовак ільна-насеньня выкананы ўсяго на 24 проц., а загатоўкі ільна-валакна амаль не пачаліся. Яшчэ не пачалася здача ільняной саломы і трэсты для заводаў ільнапяньковага аб'яднаньня.

Дажджлівае лета і восень у некаторых адносінах зацягнулі ўборку ільну. Аднак, гэтым ніяк нельга апраўдваць тое пагражаючае становішча, у якім апынуліся загатоўкі ільна-насеньня і валакна.

Асноўная прычына прарываў на фронце ільна-загатовак у тым, што да загатовак асноўных відаў прамысловага і экспартнага сырцу ня прыцягнута грамадзкасьць, а ў некаторых раёнах загатоўчыя і рэгулюючыя арганізацыі зусім не займаліся гэтым пытаньнем.

У радзе сельсавятаў ад кулака па цьвёрдых заданьнях не паступіла ні адкага грама насеньня і валакна. Ёсьць выпадкі прымірэнчых адносін да кулацкіх гаспадарак, якія сабатуюць здачу ільну. Кулацкія гаспадаркі, якія адмаўляюць здаваць пён, ня прыцягваюцца да судовай адказнасьці. У некаторых раёнах лічаць, што кулакоў зусім няма.

Ці цярпіма такое становішча, калі кулак беспакарана ўхіляецца ад выкананьня цьвёрдых заданьняў? Бязумоўна, не!

ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА БЯЗЬЛІТАСНА УДАРЫЦЬ ПА ПРЫМІРЭНЧЫХ АДНОСІНАХ ДА КУЛАКА, ПА ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ Ў ІЛЬНА-ЗАГАТОЎКАХ. У БЛІЖЭЙШЫЯ-Ж ДНІ ПАВІННА ПАСТУПІЦЬ УСЯ ПРАДУКЦЫЯ, ЯКУЮ АБАВЯЗАНЫ ЗДАЦЬ КУЛАЦКІЯ ГАСПАДАРКІ.

З боку райкаапсаюзаў наглядаюцца няўважлівыя адносіны да збору ЗАКАНТРАКТАВАНАГА ІЛЬНА-НАСЕНЬНЯ, не гаворачы ўжо аб ІЛЬНА-ВАЛАКНЕ.

Першы тэрмін здачы закантрактаванага ільна-насеньня ўжо прайшоў, а паступіла толькі 2 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

Упічаючы тое, што асеньняя загатоўчая кампанія павінна быць скончана ў сьнежні месяцы, трэба зараз-жа мабілізаваць усе сілы і кінуць іх на дагэтыя мінуўшы збор закантрактаванай прадукцыі — ільна-насеньня і валакна.

Трэба завастрыць пытаньне аб СВАЯЧАСОВАЙ І ПРАВІЛЬНАЙ АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНА-ВАЛАКНА. На жаль у гэтай галіне справа стаіць нездавальняюча.

Пляны будаўніцтва ільна-апрацоўчых пунктаў выконваюцца вельмі дрэнна. Так, у 1929 годзе з вызначаных плянам 12 ільна-апрацоўчых пунктаў пабудаваны толькі 2, а з вызначаных плянам будаўніцтва 1930 г. — 39 ільна-апрацоўчых пунктаў будзе пушчана ня больш 25-ці. Такое выкананьне плянаў будаўніцтва зрывае своячасовую апрацоўку ільну.

У раёнах былой Магілёўскай акругі будаўніцтва ільна-апрацоўчых пунктаў зусім сарвана.

Зараз-жа трэба прыняць усе меры, каб выканаць пляны будаўніцтва. Завезаныя ільнамашыны, якія нельга будзе скарыстаць на ільна-апрацоўчых пунктах, павінны быць прыстасаваны для работы ў гумнах калгасаў. Для своячасовай і хуткай апрацоўкі ільну трэба зараз-жа кінуць у вёску той дробны с.-г. інвэнтар, які ёсьць у многіх райкаапсаюзах. Трэба тэрмінова арганізаваць брыгады для апрацоўкі ільну ў пасёлішчых таварыствах.

Справа забесьпячэньня прамысловасьці сырцом і экспарту патрабуе поўнага выкананьня плянаў загатовак.

ЛАЦІС.

Чырвоны абоз з бульбай.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ СЫРЦОМ

Дабіцца ўзмацненьня загатовак ільну

Учора ў Наркамгандлю адбылася нарада па пытаньнях уборкі, першапачатковай апрацоўцы і загатовак ільну.

На нарадзе высьветлілася, што становішча загатовак тэхнічных культур—вельмі дрэннае, што ставіць пад пагрозу забесьпячэньне прамысловасьці сырцом і выкананьне экспартнага пляну. Так, замест 900 тон, якія павінны былі быць загатоўлены ў кастрычніку —загатоўлена ўсяго 25 тон.

На мясцох да гэтага часу пытаньням загатовак тэхнічных культур не аддавалася ніякай увагі.

У радзе раённых пляны загатовак не даведзены да сяла, цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам ня даны. Грамадзкасьць і камісіі садзейнасьці ня ўцягнуты ў выкананьне пляну загатовак тэхнічных культур.

Работнікі ільна - загатоўчых арганізацый скарыстоўваюцца на загатоўку бульбы, на іншыя работы, толькі не па сваім прызначэньні.

Калгасцэнтр, Белсельтрэст і Насентрэст не праінструктавалі калгасы і саўгасы аб парадку замочкі і хаваньня ільняной саломы

Ільнаканапляводсаюз павінен быў да пачатку загатовак пабудаваць 41 сушыльна-мяльны пункт і43 мачальных ямы. На сёньняшні дзень фактычна арганізаваны толькі 11 пунктаў па першапачатковай апрацоўцы ільну і 6 мачальных ям. Калегія Наркамзему перадала гэту справу пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

У Дрысе, Лёзьне, Шклове і Боркавічах яшчэ сёлета павінны былі быць пабудаваны заводы па апрацоўцы ільну. Толькі ў сьнежні будуць гатовы два заводы ў Дрысе і Лёзьне, а рэшта толькі ў будучым годзе. Такія тэмпы работ Ільнапяньковага аб'яднаньня зрываюць пляны апрацоўкі ільну.

Ня лепш адносіцца да загатовак ільну Тэкстыльаб'яднаньне. На сёньняшні дзень яшчэ не арганізаваны прыёмачныя базы ільну для прамысловасьці. Дагаворы з загатоўчымі арганізацыямі да гэтага часу яшчэ не заключаны. Фонды прамтавараў, якія вызначаны для стымулявaньня ільназагатовак, у раёны не завезены.

Нарада прызнала неабходным прасіць вышэйшыя органы завастрыць пытаньне аб узмацненьні загатовак ільну.

ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў запрапанавана выпучыць рабочую брыгаду з 15 чал. для пасылкі ў ільнаводныя раёны. Цэнтральным загатовачым арганізацыям запрапанавана выпучыць 35 чалавек для пасылкі ў раёны.

А.

Уключайцеся ВА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС

СЬЛЕДУЙЦЕ ПРЫКЛАДУ КАЛГАСУ „ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК"

БАЯВОЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ АСЕНЬНЯЙ С.-Г. КАМПАНІІ НА АСНОВЕ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ, КАНКРЭТНЫЯ ПОСЬПЕХІ У СПРАВЕ ПАДРЫХТОЎКІ І АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ—ЗАРУКА ПЕРАМОГІ У ЗМАГАНЬНІ ЗА ПЯРШЫНСТВА

Копка бульбы ў калгасе «Чырвоны араты» (Крупскі раён)

Калгас „Энгельс" заваяваў права быць удзельнікам Усесаюзнага конкурсу

«Зьвязда» лічыць неабходным высунуць на ўсесаюзны конкурс адзін з буйнейшых калгасаў БССР—с.-г. арцель «ЭНГЕЛЬС», Уваравіцкага раёну.

ПАДСТАВЫ:

Калгас «Энгельс» пад кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б, узяўшы сапраўды ўдарныя, баявыя тэмпы работы, дасягнуў значных посьпехаў у выкананьні бягучых гаспадарча-палітычных задач.

«Энгельс» першым у раёне і своячасова скончыў асеньнюю сяўбу, перавысіўшы пасеўны плян на 30 гэктараў.

Маючы да 250 га пасеваў бульбы, «Энгельс» першым з усіх калгасаў раёну цалкам і поўнасьцю скончыў уборачную кампанію.

«Энгельс» выкнаў плян збожжазагатовак на 200 проц. і зараз сам адгружае прапетарскім цэнтрам 2 эшалёны бульбы.

«Энгельс» выканаў плян укамплектаваньня сваёй малочнай фэрмы і мае на сёньнешні дзень 700 дойных кароў.

«Энгельс» рыхтуе і арганізуе новы калгасны прыліў, упарта змагаючыся за пераход адзінаасобных бадыяцка-серадняцкіх мас на сацыялістычны шлях, на шлях калектывізацыі. У калгасе створаны вярбовачныя камісіі, якія разгарнулі работу па калектывізацыі адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У дні калектывізацыі і ўр'джаю «Энгельс» арганізаваў два новыя калгасы. Правільнае размяшчэньне ўраджаю і прыбыткаў па колькасьці і якасьці працы, праведзенае ў калгасе «Энгельс», зьявілася магутным вагаром новага калгаснага прыліву.

Гэтых посьпехаў калгас дабіўся, дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі ў галіне калгаснага будаўніцтва. Парт'ячэйка калгасу правільна і выразна ажыцьцяўляе дырэктывы партыі, зьяўляючыся сапраўдным арганізатарам і кіраўніком будаўніцтва калгасу. Рады ячэйкі растуць. Ячэйка ўцягнула ў партыю 20 лепшых калгасьнікаў-ударнікаў.

У калгасе «Энгельс» серадняк прыцягнуты да гаспадарчага кіраўніцтва. Вопыт серадняка правільна і ўсебакова выкарыстоўваецца.

Выразнае кіраўніцтва з боку ячэйкі КП(б)Б плюс сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і правільная арганізацыя працы забясьпечылі калгасу «Энгельс» гэтыя дасягненьні і даюць яму поўнае права ўключыцца ў барацьбу за пяршынства ва ўсесаюзным конкурсе.

„Чырвоны Кастрычнік" змагаецца за пяршынства

Калгас уключыўся ў конкурс

УШАЧЫ. (НАШ КАР.)

Калгас «Чырвоны Кастрычнік», Ушацкага раёну, паказвае бальшавіцкія тэмпы работы. Дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву «Чырвоны Кастрычнік» першым з усіх калгасаў раёну да «дня калектывізацыі і ўраджаю» скончыў уборачную кампанію і асеньнюю сяўбу. Усе заданьні па загатоўках значна перавышаны. Толькі адзін збожжазагатоўчы плян калгас выканаў з перавышэньнем на 20 тон. Аграмінімум па ўсіх палявых работах, зьвязаных з асеньнім пэрыядам, выкананы на 100 проц. Калгас дабіўся вялікіх посьпехаў у сваёй работы па мабілізацыі сродкаў. Першым у раёне «Чырвоны Кастрычнік» поўнасьцю здаў с.-г. падатак і выканаў заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» на 150 проц.

Мінулы год прайшоў пад знакам няўхільнага росту калгасу. Склад калгасу з 1/X-1929 г. па 1/X-1930 г. павялічыўся больш, чым на 300 проц. Колькасьць гаспадарак, аб'яднаных калгасам за гэты пэрыяд, выраслa на 88. Зараз «Чырвоны Кастрычнік» налічвае 114 гаспадарак і мае плошчу ў 1197 гэктараў, у той час, як усяго толькі год назад калгас яднаў 26 гаспадарак на плошчы ў 349 га.

«Чырвоны Кастрычнік» не адгарадзіўся ад адзінаасобнікаў, а ўсямерна імкнецца ўцягнуць іх у калгас. Аб гэтым ярка сьведчаць вышэй паданыя лічбы, якія характарызуюць дынаміку росту калгасу. Адзінаасобнікі раёну ня раз выбіралі спэцыяльныя дэлегацыі, якія падрабязна знаёміліся са складам калгасу. Гэтыя дэлегацыі ў выніку зьявіліся дакналымі агітатарамі за калгас.

Калгас мае ўласную школу, ясьлі, клюб. Шырока разгорнута масавая работа. Дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з суседнім калгасам імя Леніна цалкам выкананы. Напярэдадні «дня калектывізацыі і ўраджаю» калгасьнікі на агульнакалгасным сходзе прэміявалі 10 сваіх лепшых ударнікаў. З гэтых 10 адзначаны як перадавыя ўдарнікі, паказаўшыя ўзор камуністычных адносін да працы, калгасьнікі Лісоўская, Гунько, Птушко (да ўступленьня ў калгас яны былі батракамі).

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» УКЛЮЧЫЎСЯ ВА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС. На сходзе калгасьнікі заявілі, што яны прыкладуць усе намаганьні, каб апраўдаць ганаровую назву свайго калгасу—«Чырвоны Кастрычнік».

АДКАЗ НА КУЛАЦКІ ПАДПАЛ

СЛУЦАК. (Сьпешнай поштай).

У часе асеньняй сяўбы ў вёсцы Селішча, Слуцкага раёну арганізаваўся калгас «Шлях калектывізацыі», у які ўступіла 9 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Новы калгас баявым тэмпам правёў сяўбу азімых і скончыў зяблева. Кулацтва, разьюшанае посьпехамі калгасаў, імкнулася запалохаць калгасьнікаў, каб прымусіць іх выйсьці з калгасу. Надаўна кулакі падпалілі гумно са збожжам, якое належала аднаму з арганізатараў калгасу калгасьніку т. Макарэйка. Гэта тэрарыстычная вылазка не апраўдала надзей клясавага ворага

У адказ на кулацкі тэрор, 14 кастрычніка, напярэдадні «дня калектывізацыі і ўраджаю», па пажарышчы адбыўся вялікі сход калгасьнікаў трох суседніх сельсаветаў і адзінаасобнікаў вёскі Селішча. Сход ператварыўся ў сьвяткаваньне «дня калектывізацыі і ўраджаю». Калгасьнікі с.-г. арцелей «Трактар» і «Новае Жыцьцё» ў знак сваёй калгаснай салідарнасьці прывезьлі каля аднэй тоны збожжа для тав. Макарэйка, які пацярпеў ад кулацкага падпалу. Сам Макарэйка ў адказ на тэрарыстычную вылазку кулацтва, завербаваў у калгас трох новых калгасьнікаў. Тут-жа на сходзе 19 сем'яў адзінаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў і 4 адзіночкі падалі заявы аб уступленьні ў калгас. Калгас «Шлях калектывізацыі» пастанавіў узяць на буксір калгас «Трактар», які адстае ва ўборцы бульбы.

Райштаб.

„НАМ НОВЫЯ КАЛГАСЬНІКІ НЕПАТРЭБНЫ"

МАГІЛЕЎ. (НАШ КАР.).

Тэмпы сяўбы ў раёне зусім НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ. Яны ні ў як

Падрыхтоўка да Кастрычніцкіх сьвят

Новыя заводы ўступаюць у строй

Гаспадарчыя арганізацыі БССР дзейна рыхтуюцца да правядзеньня Кастрычніцкіх сьвят. Вазначана адкрыць новыя фабрыкі і заводы, перавесьці рад прадпрыемстваў на 7-гадзінны рабочы дзень і бесьперапынны рабочы тыдзень.

У Кастрычніцкія дні адбудзецца ўрачысты пуск Асінбуду. На ўрачыстасьці запрошаны прадстаўнікі Саюзнага ўраду і саюзных рэспублік, рабочых і грамадзкіх арганізацый.

У Магілеве будзе пушчана фабрыка штучнага валакна.

Па лініі швэйнай прамысловасьці вызначана адкрыць швэйную фабрыку ў Віцебску на 4.500 рабочых. Фабрыка абсталявана швэйнымі машынамі савецкай вытворчасьці. Разам з гэтым адбудзецца ўрачыстае адчыненьне ясьляй, сталоўкі і 20-кватэрнага дому для рабочых новай фабрыкі.

У Менску адкрываецца 24-кватэрны дом для рабочых фабрыкі «Кастрычнік».

У дні Кастрычніцкіх сьвят пераходзяць на 7-гадзінны рабочы дзень швэйныя фабрыкі—імя Дзяржынскага ў Бабруйску і імя Валадарскага ў Магілеве.

Па МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ пераводзяцца на 7-гадзінны рабочы дзень заводы «Пралетарый» і імя Ланцуцкага ў Гомелі, а таксама заводы «Інтэрнацыянал», «Ударнік», «Полымя Рэвалюцыі» і завод імя Сталіна.

Адкрываюцца новыя цэхі на акулярнай фабрыцы ў Віцебску і на заводзе «Адраджэньне» ў Магілеве.

На Гомсельмашы адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё сталоўкі для рабочых.

Па ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ да Кастрычніцкіх сьвят прызначана адчыненьне новых тарфяных заводаў «Чырвоны Сьцяг», «Чырвоная Беларусь» і заводу па выпрацоўцы ізаляцыйных пліт.

Па ГАРБАРНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ пераводзяцца на 7-гадзінны рабочы дзень гомельская абутковая фабрыка і пераходзіць на бесьперапынны рабочы тыдзень завод «Бальшавік» у Менску.

Белдзяржбудаб'яднаньне канчае да Кастрычніцкіх сьвят пабудова дому дзяржбанку ў Менску, цэху на заводзе «Адраджэньне», часальнага корпусу на аршанскім льнапрадзільным камбінаце і віцебскай швэйнай фабрыцы.

А.

Правесьці ў жыцьцё важнейшую пастанову ЦКК

Адзначаючы вялікае значэньне для работы КК-РСІ выданьне лісткоў РСІ, 2-гі пленум ЦКК УсесКП(б) яшчэ ў 1928 г. прызнаў «жаданым і мэтазгодным выданьні лісткоў РСІ ва ўсіх губэрскіх і краявых газэтах.

Гэты-ж пленум тады яшчэ вызначыў зьмест лісткоў РСІ: «Неабходна дабіцца, каб у лістках падкрэсьліваліся не маленькія факты, а давалася - б сур'ёзная і абгрунтаваная крытыка нашых недахопаў на асноўных участках будаўніцтва і побач з гэтым нашыя дасягненьні, выяўляючы прыклады добрай работы».

Па даручэньні ЦКК УсесКП(б) у пачатку бягучага году ЦК КП(б)Б было праведзена абсьледваньне лісткоў РСІ, пры якім выявілася, што за выключэньнем лістка РСІ пры «Віцебскім Пралетарыі» усе лісткі як пры цэнтральных, так і пры акруговых газэтах, выходзяць вельмі нерэгулярна і што асноўным тормазам у работе ўсіх бяз выключэньня лісткоў зьяўляецца адсутнасьць у рэдакцыях сталых адказных працаўнікоў, якія працавалі-б над афармленьнем лісткоў РСІ.

Лічачы гэткае становішча ў выданьні лісткоў РСІ ненармальным, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б 9-га лютага г. г. ухваліў:

1. «Лічыць абавязковым для ўсіх газэт як цэнтральных, так і акруговых выданьняў «Лістка РСІ», адмовіўшыся ад іншых назваў «Пад кантроль мас», «У дапамогу інспэктару РСІ», «У бліскот РСІ» і г. д. за выключэньнем газэты «Чырвоная Зьмена», у якой назву лістка заставіць па-ранейшаму «Лісток лёгкай кавалерыі».

2. Усім рэдакцыям газэт вылучыць спэцыяльнага супрацоўніка, на якога ўскладзьці абавязак загадчыка «Лістка РСІ». Загадчыкі лісткоў павінны трымаць самую цесную сувязь з мясцовымі РСІ і арггрупай ЦКК у Менску.

3. Лісткі РСІ павінны выходзіць ня менш 2-х разоў у месяц, прысьвячаючы актуальным тэмпам работы адпаведных РСІ на гэты момант (чыстка апарату, НКІО, пэфства рабочых над установамі, выдучэньне, асобныя галіны работы савецкага, каапэрацыйнага апарату, рацыяналізацыі і г. д.), суправаджаючы матар'ял Лісткоў артыкуламі, даючымі мэтаную палітычную ўстаноўку.

4. У Лістках-шырэй скарыстоўваць матар'ял масавых абсьледваньняў і палётаў, якія робяцца органамі РСІ, зьмяшчаючы, як мага больш, матар'ялу непасрэдных удзельнікаў гэтых абсьледваньняў і палётаў, скарыстоўваючы адначасова рабкораўскія матар'ялы па гэтым пытаньні.

5. У мэтах дзейнасьці крытыкі Лісткоў, завісьці ў лістках, па прыкладзе «Правды» аддзелы, у якіх пісаць аб выніках, зьмешчаных у папярэдніх лістках матар'ялаў.

Здавалася-б, што ўсё ясна, але да гэтага часу (а ўжо прайшло 9 месяцаў) пастанова прэзыдыуму ЦКК ніводнай з цэнтральных газэт, за выключэньнем «Савецкай Беларусі» і «Чырвонай Зьмены», якія удасужыліся толькі на дніх вылучыць спэцыяльных людзей для гэтай работы, ня выканана. Больш таго: сама ЦКК на працягу ўсяго гэтага часу не праверыла, як праводзіцца ў жыцьцё адна з важнейшых пастаноў.

Характэрнейшым за ўсё зьяўляецца той факт, што некаторыя работнікі рэдакцый да гэтага часу ўпарта не жадаюць выканаць пастановы ЦКК.

Работнікі рэд. «Юнгер Арбэйтэр» т. т. Вайнгаўз і Лебедзеў на пытаньне—чаму з мая месяца спыніліся выданьне «Лістка Лёгкай Кавалерыі»—заявілі: «Мы цяпер уступілі ў трэці год пяцігодкі,—гэты год патрабуе ад нас новых тэмпаў работы і таму рэдакцыя ня можа выкраіць на старонках сваёй газэты месца для «Лістка Лёгкай Кавалерыі».

Такім чынам, на думцы гэтых т. т. выходзіць, што перабудова на аснове ўзятых партыяй і рабочай клясай тэмпаў у трэці рашаючы год пяцігодкі датычыць усіх, баз выключэньня, арганізацый і галін работы, але ня «Лісткоў РСІ і Лёгкай Кавалерыі», якія павінны арганізаваць і накіраваць творчую ініцыятыву усяе рабочае клясы, бядняцка-серадняцкай і калгаснай масы ўсёй на барацьбу за новыя тэмпы, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Аб тым, што некаторыя рэдакцыі недапушчальна агідна адносяцца да пастановы прэзыдыуму ЦКК відаць хаця-б з таго факту, што па заяве сакратара рэдак. «Акцябр», адказным за выданьне «Лістка РСІ», зьяўляецца тав. Мельнік, а лісток ужо месяцамі ня выходзіць. Яшчэ больш абуральным зьяўляецца той факт, што некаторыя адказныя работнікі рэдакцый да гэтага часу не разумеюць і фактычна ня ведаюць аб існаваньні пастановы Прэзыдыуму ЦКК, ня гледзячы на тое, што гэта пастанова ў свой час была разаслана ўсім рэдакцыям газэт.

Мы зараз уступілі ў трэці, рашаючы год пяцігодкі. У гэтым годзе, у сувязі з вялізарным ростам сацыялістычных элемэнтаў нашае краіны, калектывізацыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як класу, на базе суцэльнае калектывізацыі, мы сутыкнёмся з упартым супраціўленьнем адміраючага клясавага ворага (кулака, попа, бюрократа, нэпмана, шкодніка і сымулянта), які ўсімі сіламі імкнецца падарваць пасьпяховы ход нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Лісткі РСІ прызваны да мабілізацыі рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі па перамаганьне няжасьцяй, на пасьпяховае завяршэньне справы будаўніцтва сацыялізму. Нагаваў, зусім недапушчальны такім на сутнасьці, агідным адносінам да работы Лісткоў РСІ.

Вось чаму ЦКК павінна будзе прыняць усе неабходныя меры, каб у самыя бліжэйшыя дні забясьпечыць пачатак плянава-сыстэматычнага выхаду Лісткоў РСІ.

С. ШОК.

АПОШНІЯ ДНІ СПЛАВУ

„Пробкі" з лесаматар'ялаў у прыстаней. Не дапусьціць, каб лёд зацёр сплаўлены лес

Становішча сплаву за апошнюю пяцідзёнку амаль не палепшылася.

На 20 кастрычніка пушчана ў сплаў 94 проц. плянавага заданьня па будаўнічых матар'ялах і 93,1 проц. — па дровах. На месцы прыбыло будаўнічых матар'ялаў 76,3 проц. і дроў 75,1 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што сплаў ня будзе скончаны да 1 лістапада.

Асаблівую небясьпеку выклікае выгрузка лесу з вады. Усяго выгружана 56,7 проц. будаўнічага матар'ялу і 56,8 проц. дроў.

Напружанае становішча з выгрузкай дроў з вады пагыбляецца яшчэ тым, што мясцовыя арганізацыі не аддаюць гэтай справе патрэбнай увагі.

Асабліва дрэнна ідзе сплаў на Бярэзінскім і Бягомльскім вучастках. Шмат лесаматар'ялаў на гэтых вучастках знаходзіцца ў вадзе, а адлегласьць ад прыстаней да месца выгрузкі настолькі вялікая, што лес прыбудзе туды не раней як праз 10-15 дзён.

Зараз трэба выгрузіць з вады ўжо прыбыўшы лес, каб потым можна было перакінуць усе сілы і гужавы транспарт на выгрузку лесу, сплаў якога спазьніўся.

Аршанскі, Друцкі, Прапойскі лесапрамгасы ўвесь час марудзілі з пускам драўніны ў сплаў і ўсхамянуліся толькі ў апошні час.

Чачэрскі, Рэчыцкі лесапрамгасы спадзяваліся на тое, што адлегласьць, якую павінен прайсьці сплаўлены лес на іх вучастках, кароткая і да апошняга часу не пачыналі сплаву.

Пагражаючае становішча сплаву драўніны ў Мазыры. Для перавозкі дроў патрэбна 30 баржаў, а Дзяржпараходства дало толькі 6. Ня гледзячы на катэгарычныя прапановы СНК Беларусі аб дачы барж, Дняпроўскае Дзяржпараходства не дае баржаў для перавозкі дроў. У выніку гэтага 30-40 тысяч куб. мэтраў дроў і 2.000 куб. мэтраў лесаматар'ялаў для Донбасу могуць застацца зімаваць на прыстанях.

У Гомельскім сплаўным раёне Дзяржпараходства таксама зрывае перавозку драўніны. 25 тыс. куб. мэтраў драўніны ляжыць на прыстанях Гомельскага сплаўнога вучастку, а Дзяржпараходства дае распараджэньні аб перанідцы адтуль баржаў.

Выгрузка лесаматар'ялаў з вады да апошняга часу праходзіць недапушчальна марудным тэмпамі. Напрыклад, па Нова-Беліцкім заводзе «Калектыўная Праца» ў дзень выгружаюць з вады 500 куб. мэтраў драўніны, у той час, як на прыстані гэтага заводу стварылася проб ка ў 54 тыс. куб. мэтраў.

Ля прыстані заводу імя Хапцурына таксама згрудзілася 18 тыс. куб. мэтраў. Там тэмпы выгрузкі яшчэ меншыя — 400 куб. мэтраў у пяцідзёнку.

Заводзкія арганізацыі да апошняга часу не мабілізаваліся на выгрузку драўніны з вады.

Да канца навігацыі і наступленьня першых замёрзкаў засталося вельмі мала часу, ня кажучы ўжо аб тым, што ўвесь сплаў паводле пляну павінен быць скончаны да 1 лістапада. Апошнія дні сплаву трэба выкарыстаць для 100%-нага выкананьня праграмы бягучага году.

Яз. С—ны.

Агіднасьці ў жыльлёвабудаўнічай каапэрацыі

11 кастрычніка адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход жыльлёва - будаўнічага каапэратыву «Чырвоны Кастрычнік». Рабіла справаздачу брыгада, якая на працягу 4-х месяцаў абсьледвала работу праўленьня каапэратыву. З інфармацыі брыгады і выступленьняў пайшчыкаў выявілася, што ў 40 кватэрным доме 16 пайшчыкаў спакулявалі кватэрамі. Гэта рабілі нават члены праўленьня.

Заявы пайшчыкаў з рэзалюцыямі РСІ не разглядаліся. Старшыня рэвізійнай камісіі т. Быкаў ніякіх адказаў пайшчыкам не даваў.

Памяшканьне, у якім павінна была быць адкрыта сталоўка, пустуе. Культфонд ня выкарыстаны, і ніякай культурнай работы не вядзецца.

Цікава, што старшыня сходу адмовіўся назваць прозьвішчы пайшчыкаў, якія спэкулявалі кватэрамі.

Белжылсаюзу і пракуратуры трэба зацікавіцца справамі каапэратыву «Чырвоны Кастрычнік».

НАБАТ.

Рабочае забесьпяченьне —пад рабочы кантроль

Апошняе слова---за пракурорам

Бягомльская каапэрацыя зрывае рабочае забесьпячэньне

Таварныя фонды разбазарваюцца

Анархістычная практыка панае ў рабоце Бягомльскай спажывецкай каапэрацыі. Гэта практыка прыняла да валікіх прарываў у справе загатовак і забесьпячэньня.

Трэба было ў верасьні загатовіць 6 тон мяса, загатоўлена толькі 3,3 тоны; трэба было загатовіць 147 тон збожжа, загатоўлена — 104,6 тоны.

Планы не выкананы, ня гледзячы на тое, што загатоўчыкі прэміраваді адтыкаў напраса і налева. Старшыня раённага спажывецкага таварыства тав. Пізьвелеў дазволіў загатоўшчыкам ня прытрымлівацца норм прэміраваньня; нормы можна павялічваць, калі загатоўкі ідуць тута. Загатоўшчык Мельніжу за адну карову даў прэмію — пару ботаў, пару сапнак і клубок палітэ.

Заслуговае ўвагі сыстэма прэміраваньня адатчыкаў збожжа. Над калектыўнай здачай збожжа каапэратары разумеюць ададу некалькіх мяшкоў 2-3 фурманкамі. Калі збожжа здае чырвоны абоз, дык адатчыкі ня прэміруюцца, бо гэта не «калектыўная здача». Старшыня таварыства даў загад ня выдаваць прэмій сераднякам, пакуль яны не ўпясуць свой пай поўнасьцю. Былі выпадкі, калі 10-15 адатчыкаў атрымлівалі ў прэмію адну пару ботаў, мала месца прэміраваньне груп адатчыкаў, незалежна ад таго, хто колькі здаў.

Вельмі дрэнна забясьпечваліся прадуктамі і прамтаварамі рабочыя лесарубы і плытагоны. Фонд забясьпячэньня плытагонаў напалову разбазараны.

Відома, як гэта адбілася на становішчы сплаву.

Ня лепш забясьпечваюцца рабочыя, занятыя на будаўніцтве сьвінарнікаў і школ.

З фондаў на забясьпячэньні плытагонаў раскрадзена 185 пар ботаў і 27.000 мэтраў мануфактуры.

Дырэктыва аб забясьпячэньні пастаўніцтва на рабочых нормах дагэтуль ня выконваецца.

Грамадзкае хартаваньне ў Бягомлі — у агідным становішчы. Бягомльская сталоўка ня мае ніводнага кілё гародніны і не падрытавала памяшканьня для яе хаваньня. Увесь час у сталоўцы падаецца сыры хлеб, з пяском. Кніга скаргаў перапоўнена заўвагамі наведвальнікаў, але ніхто ёю ня цікавіцца.

Поўны хаос панае на адкормачным пункце.

Органы РСІ і пракуратура павінны зараз-жа вгпадміцца з работай бягомльскіх каапэратараў.

С—і.

У Жыткавічах панае самазабесьпячэньне

Праўленьне Жыткавіцкага спажывецкага таварыства працуе вельмі дрэнна. Рабочае забесьпячэньне кульгае на абедзьве нагі з-за нядбайных адносін каапэратараў. Нядаўна пасвавалася 21 бочка буркоў, прышлося таксама выкінуць бочку пасаванага расьліннага масла.

У разьмеркаваньні дэфіцытных тавараў панае самазабесьпячэньне. Кансэрваў нікому не выдаюць, іх атрымліваюць толькі члены праўленьня; прымусы разьмяркоўвае сам старшыня таварыства. Прадстаўнік Белкаапсаюзу атрымаў з базы адну пару абутку, адну пару туфель і 2 пары галёш.

Агіднасьцям у рабоце жыткавіцкіх каапэратараў трэба пакласьці канец.

ГРАЧУХІН.

Ігнаруюць спажыўца

Дырэктывы парыяў аб павышэньні рэальнай зарплаты рабочых, як відаць, не датычаць Багушэўскага раённага спажывецкага таварыства. Апошняе ігнаруе інтарэсы спажыўца. Абеды ў сталоўцы вельмі ніякай якасьці і каштуюць дорага—40 кап. У пагоні за прыбыткамі, каапэратары бяруць за шклянку гарбаты бяз цукру 5 кап. Раённае спажывецкае таварыства парушае нормы на хлеб — 400 грам хлеба ў сталоўцы пры Стайкаўскай пільні каштуе 8 кап. Каапэрацыя ўсім ня есьць за становішчам арандаваных садоў. Яблыкі гніюць, няма памяшканьняў для іх хаваньня, няма пакавальных матар'ялаў і скрынак.

Работа раённага спажывецкага таварыства патрабуе пільнага грамадзкага кантролю.

ШАСТАПАЛАЎ.

Каму патрэбна такая работа?

Праспалі загатоўкі гародніны

Халопеніцкі раённы спажывецкі саюз склікаў нядаўна нараду ўсіх работнікаў каапэрацыі. Заслухоўваліся даклады з мясц аб ходзе загатовак, рабоце каапэрацыі за гэты год.

Высьветлілася, што сацспаборніцтва і ўдарніцтва не адчуваецца ў рабоце халопеніцкай каапэрацыі.

Праўленьне спажывецкага таварыства ні разу не заслухоўвала інфармацый аддзяленьняў і загадчыкаў буйных крам.

Недапушчальна марудна праходзяць мясазагатоўкі. У кастрычніку трэбы было загатовіць 69 цэнт. мяса, загатоўлена — 9 цэнт., замест 39 цэнт. бараніны, загатоўлена 1,5 цэнт. Плян загатовак воўны выкананы толькі на 20 проц.

Толькі тыдзень назад спажывецкае таварыства дало дырэктыву аддзяленьням пачаць загатоўкі гародніны. Гэта ў той час, калі надышла зіма, і нават у халопеніцкай сталоўцы няма запасаў гародніны. Сталоўка загатовіла толькі пару невялікіх бочак гуркоў, а спэкулянты з рынку загатаўялі грукі цэлымі вазамі і прадавалі іх значна дарожэй, чым каапэрацыя.

У Чырвоных Луках ёсьць 6 складоў са збожжам, ды нема замкоў—загадчык складамі ня сьпіць на начох і ўсё баіцца, каб не атысьцілі гэтыя бясплатныя склады.

АЙМОР.

УВАГА АВІЯХІМАТРАДАУ

Назначаныя паўторныя заняткі на 27-га кастрычніка ПЕРАНОСІЦЦА на 26-га кастрычніка г. г. Яўка ўсіх абавязкова. Адказнасьць за яўку ўскладаецца на сакратароў ячэек Асавіяхіму.

ЦС і райсаветы АСО.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Ніжэйпералічаныя т. т., выпучаныя для паездкі ў раёны па працы культэстафэты, павінны зьявіцца на інструкцыйную нараду 26-га кастрычніка, а 2-й гадз. дня ў Дом Працесьветы. Яўка абавязкова і без спазьненьня: 1. Ад сэкцыі навук. працаўнікоў т. т. Каган, Маўшовіч, Гэлер, Гусева, Бэйлін, Вярпшк, Блядуха, Казак, Анкінадзі-Сьвірская, Сосіс, Кернажыцкі, Скардзіс, Гарбач, Баркоўскі, Віленкін, Кузуноў, Кныш, Кіпелевіч, Сэрбаў, Гельбэрх, Тарайновіч, Шапалевіч, Жылуновіч, Шапеткіна, Малінін, Цыркіна, Лобач, Амбрасенка, Гаузэ і Гольшток. 2. Студэнты пэдфаку БДУ т. т. Храмовіч, Ліхадзіеўскі, Паўлоўскі, Коршунаў, Лук'янчук, Дуброўскі, Паваротны, Школьнікава, Вільтоўскі, Матышка, Гурчонак, Бурлыка, Баркоўская, Паўлоўскі, Кавалёў, Маўфэ, Хацкевіч, Акрашэвіч, Палаўцоў, Хэйфэц і Каваленка. 3. Студэнты наргасу БДУ т. т. Паўлючэнка, Будзікаў, Разоўская, Раманёнак, Крысьлаў, Івановіч, Крываносаў, Шаўковіч, Шафранскі і Іваноў. 4. Студэнты факультэту саўбуду і права т.т. Мар'яхін Я., Бабіцкі Б., Перапяцітык І., Заніслевіч І., Султан М. 5. Студэнты Камвузу т. т. Пячонка, Увус, Іосіпаў, Зуяў, Драчун, Ротчанка, Саўко, Субачоў, Сухавіцкая і Чыгранец. 6. Студэнты мад. інстытуту т. т. Урэцкая, Лінмянава, Чарвінскі, Афмагель і Дубоўскі. 7. Ад ЦП саюзу працасьветы т. т. Чарнецкая, Рогава—ЦК, Дубэрштэйн, Новадворская—30 школа, Лаўрановіч—38 школа, Улазаў—Дом Кам. Асьветы; Эстэркіна, Навабрацкая—7 групком, Усьпенская—4 школа і Цырульнікаў—16 школа. 8. Ад ЦК камсамолу т. т. Хаймоўская—БКС, Шымпаневіч—Ашчаджасэ 16, Леванівіч—Вярх. суд. Севельман—Белсампрамсаюз, Каганові—Калгасцэнтр, Казлова—Дзяржплян, Мядзьведзеў—БДКіно, Дрэйзін—НКГандаль, Альтшулер—ВСНГ і Новік-Дзяржшвэймашына.

Штаб Культэстафэты.

СЕНЬНЯ:

— БДУ. А 6 г. увеч., у памяшк. МК БДУ адбудзецца адкрыты сход яч. КП(б)Б техн. і навук. працаўнікоў БДУ. Яўка партыйцаў абавязкова. Запраш. беспартыйных.

— Наргас БДУ. А 8 з пал. г. увеч. адбудуцца адкрытыя сходы яч. КП(б)Б— прамысловага аддз. у аўд. № 317, каап. і сельска-гасп.—аўд. 219, плянава-стат.—аўд. 213, і в 7 г. увеч.—фінанс. аддз. у аўд. № 309. Парадак дня: справаздача і выбары бюро ячэйкі. Запрашаюцца студэнты і навук. працаўнікі.

— Дом Асьветы. А 7 г. увеч. адбудзецца адкрыты сход партколектыву працасьветы. У нараду дня—даклад аб працы яч. КП(б)Б БАН. Запрашаюцца асьветнікі.

— Клюб навук. працаўнікоў. А 8 г. увеч. адбудзецца насяджэньне праўленьня клюбу. Запраш. т.т. Ленц, Эльбэрт Пятроў, Розэнсер-Вальфсон, Сосіс, Чарвакоў, Агеєў, Віленкін, Данільчык, Неткін, Ваўчопак, Камінская-Паўлава, Нізмець і Гелер.

— БДУ. А 7 г. увеч., у гал. корп., аўд 302, 3-ці паверх, адбудзецца адкрыты партыйны сход яч. КП(б)Б факультэту саўбуду і права. Яўка ўсіх партыйцаў і камсамольцаў абавязкова. Запраш. студэнцтва і навук. працаўнікі.

— ЦБ СНП паведамляе навуковых працаўнікоў гор. Менску, што рэгістрацыя навуковых працаўнікоў 1 іх сем'яў, жадаючых харчавацца ў сталоўцы, якая адкрываецца для навуковых працаўнікоў, будзе праводзіцца ў клюбе навуковых працаўнікоў ад 7 да 10 гадз. увеч. з 25 да 30-X.

— 27-X, а 7 г. увеч., у залі клюбу працасьветы склікаецца шырокі прафактыў на пытаньні ходу культпагляду на г. Менску. Яўка заг. культсэктараў ЦП саюзаў, заг. клюбаў, культсэктараў ФЗК і рабочых брыгад абавязкова.

Зварачаем увагу ФЗК і ЦП саюзаў на няяўку 21-X значнай колькасьці актыву.

На сходзе будуць даклады ЦП саюзу металістых, клюбу металістых, заўгомаў зав. «Энергія» і «Камунар», ЦП харчавікоў, клюбу харчавікоў і заг. кому хлебазаводу.

— Кастрычніцкі райком КП(б)Б і ЦСПСБ склікаюць 1 лістапада, а 6 г. увеч., у памяш. клюбу Леніна (пав. вокз.) раённую канфэрэнцыю работнікаў раёну, з наступным парадкам дня: 1) Вынікі працаўкоўкі адозвы ЦК УсесКП(б) і падрыхтоўка да 3-га году пяцігодкі. 2) Перавыбары Савстаў. Молуе прадстаўніцтва—1 дэлегата ад 3-х работнік. На канфэрэнцыю павінны зьявіцца ў абавязковым парадку: сакратары ячэек КП(б)Б, старшыні фабкомаў і гаспадарчыя працрыемствах і устаноў. Мандаты можна атрымаць у РК 29 і 30 кастрычніка.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б і ЦСПСБ.

— Парттройка Кастрычніцкай РКК (вул. К. Маркса № 3) выклікае на 26-X—30 г., а 6 з пал. г. увеч., наступных т.т.: Бялявядову, Марголіна Я. з абутф-кі, Шэваха (БСКА), Магамета (медфак), Бандарова (сьпіртзав.), Шпейдэра (прафтэхшкола), Кісьлевага, Гладкую (гута), Вяжэвіча (абутк. майст.), Авідзона (вайск. арг.), Юрыса («Энергія»), Лебядоўскага (МЦРК), Араповіча (зямф-ка), Якутовіча (напраўчы дом), Іванова Зьмітра з Віцебску, Зотава А. К. Таксама павінны зьявіцца сакратары тых ячэек, дзе памянёныя т. т. лічацца па вучоце.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Сёньня, а 6 гадз. увеч., у памяшк. клюбу металістых (Універсытэцкая вул.) адбудзецца 3-я камсамольская канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну. Парадак дня: 1) Даклад ЦК ЛКСМБ (дакл. тав. Рындзіч). 2) Справаздача РК ЛКСМБ (дакл. т. Юрк'янец). 3) Справаздача рэвіз. камісіі. 4) Вынікі гаспаларчага году і задачы камсамолу (дакл. т. Страноўскі). 5) Выбары РК ЛКСМБ і рэвіз. камісіі. 6) Выбары дэлегатаў на X зьезд ЛКСМБ. Ячэйкам, якія яшчэ не атрымалі мандатаў, тэрмінова атрымаюць у РК ЛКСМБ.

УСІМ ГАРАДЗКІМ І РАЁННЫМ КК РСІ

У зьвязку з тым, што ня ўсе раёны яшчэ ўключыліся ў рабсельскораўскі рэйд і ў мэтах пешшага правядзеньня ўсебеларускага рэйду і падвядзеньня вынікаў—

усебеларускі рабселькораўскі рэйд працягнуць да 1 лістапада гэтага году.

Усім гарадзкім і раённым КК РСІ абгаварыць вынікі рэйду на пасяджэньні КК РСІ да 1 лістапада гэтага году.

Старшыні КК РСІ пры паездцы ў Менск на курсы-нарады павінны прывезьці з сабой вынікі і пастановы па рэйдзе.

ЦКК НК РСІ.

ДОМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

СЕНЬНЯ, 26 кастрычніка, а 7 гадз. увеч. у Доме Чырвонай арміі ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'у БЕЛАРУСІ склікае

агульна-гарадзкі сход чырвонаармейцаў, якія дэмабілізуюцца.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:
1. Даклад аб задачах чырвонаармейцаў-мопраўцаў на вёсны (дакл. т. ПАНАЎ).
Пасьля сходу—К І Н О.

ЦК МОПР'у БССР.

СЕНЬНЯ 26 КАСТРЫЧНІКА

У ПАХОД ЗА ПАПЕРУ
НАШЫРАНАЕ НАСЯДЖЭНЬНЕ
БЕЛАРУСКАГА ШТАБУ „У ПАХОД ЗА ПАПЕРУ"
АДБУДЗЕЦЦА
у памяшканьні рэд. газ. «ЗЬВЯЗДА» а 4 гадз. дня.

На пасяджэньне павінны зьявіцца наступныя т. т.: Харын (Белпапера), Фядотаў (ЦП саюзу Друкароў), Левітэ («Акцябр»), Малкаў—(«Сав. Бел.»), Бабушкін (Белуціль) Мутэр—(Белдзяржгандаль), Майкін — (БКС), Сыо — (ЦП працасьветы), Юшчанка (Цэнтрархіў), Таганова—(Чырвоная Зьмена), Станкевіч—(ЦП саюзу папярнікаў), Грабер (Кастр. РК КСМ), Браверман («Рабочай»).

На парадку дня:
1. Далейшыя задачы штабу.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Бед. Штаб „У паход за паперу".

ЦП саюзу саўгандальслужачых
сумесна з партколектывам МЦРК
склікае на 27 КАСТРЫЧНІКА, а 8 г. увеч.,
у памяшк. клюбу „САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫ"

ЗЬЛЁТ УСІХ УДАРНІКАЎ МЦРК

Парадак дня: 1. Вынікі выкананьня гандальфінпляну МЦРК за 29-30 г.; кантрольныя лічбы на асобны квартал 30 г. і на 1931 г. (дакл. Праўл. МЦРК). 2. Становішча Ударніцтва па МЦРК і іх удзел у правярэцоўцы гандальфінпляну (дакл. ЦП саюзу і рапарты Ударных крам №№ 6, 63, 13, і 83. 3. Выбары дэлегатаў на ўсебеларускую канфэрэнцыю па сацпаборніцтве і ўдарніцтве па каапэрацыі.

Яўка Ударнікаў МЦРК абавязковая. Запрашаюцца Ударнікі гандлёва-каапэрацыйных устаноў, усе працаўнікі МЦРК і рабочыя-спажыўцы.

Мастацкі ЦЫРК пік. І. Л. СТРАШЭВІЧА
СЕНЬНЯ
Нядзеля, 26 кастрычніка
ПЯЧ. а 6 з пал. гадз. увеч.

ВЯЛІКІ ВЕЧАР АРТЫСТЫХ ЦЫРКУ І ЭСТРАДЫ
з удзелам усёй трупы цырку і прыбыўшых арт. эстрады
Гастролі Масюўскага мастацкага вакальнага квартэту імя САФОНАВА
1-я гастроль прытуна-сальтаморт. К. Сосіна—трамплін
Гімнасты Бр. Джысовані кольцы
Сэнсацыяні Туэністы-трукісты Альф. і Гартвэльс на акрык. рэйках сонца 75 аваротаў
20 Н. Русель муштраваных жывёл 20
Пад купалам. ЭЙФЭЛЕВА ВЕЖА трупа БРАСТОНС і інш. №№
Расійскі атракцыён 2 Рауш 2 перш.
Жывы факел Гр. Скор паветр. акт.

31 кастрычніка, а 12 г. дня, адбудзецца
УРАЧЫСТАЕ ЗАКРЫЦЬЦЁ
ПЕРШАЙ УСЕБЕЛАРУСКАЙ ВЫСТАЎКІ
сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.
УСЕ ПРАЦОЎНЫЯ--НА ВЫСТАЎКУ!
УВАХОД СВАБОДНЫ. ДЫРЭКЦЫЯ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ
СВАЯЧАСОВА НА ГАЗЭТУ „ЗЬВЯЗДА" З ДАДАТКАМ „ПРАФРУХ"
НА ЛІСТАПАД І ДАЛЕЙШЫЯ МЕСЯЦЫ
Сваячасовая падпіска гарантуе бесьперабойнае і акуратнае атрыманьне газэты з 1 лістапада

Кіно-тэатр „Культура"
Новы амэрыканскі фільм
БІЗУН НАГЛЯДЧЫКА
Звыш праграмы: кіно-хроніка Саюзкіно № 56.
ПАСЬЛЯ КОЖНАГА СЭАНСУ
ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ.
Пачат. дзенных сэансаў а 1 гадз. Каса—ад 12 гадз. дня.
Пачат. вечэрніх сэансаў а 7 г. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
Заежны фільм
У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКУ
(НОЧ на ЗЯМЛІ)
Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. увеч. Каса адкрыта ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Новы фільм вытворчасьці „МЕЖРАБПОМ ФІЛЬМ"—Масква, „ПРОМЭТЭУС"—Бэрлін
„ЭЛЬ-ІЕМЕН"
Звыш праграмы: хроніка Саюзкіно № 37.
Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно „Юны піянэр"
2-ая серыя
Стэнлей у нетрах Афрыкі
(АДЗІН СУПРОЦЬ МНОГІХ)
Пачатак 1-га сэансу а 12 г. дня. Каса адкрыт а ад 11 гадз. раніцы.

Кіно „СПАРТАК"
Выдатны фільм
НАМУС
трагедыя ў 8 част.
Сёньня 4 сэансы
Пач. сэансаў: 5 г. 30 м., 7 г. 15 м., 9 г., 10 г. 45 м.
Каса—ад 4 г. 30 м.

Завочныя бухгальтарскія курсы
Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.
Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай па ніжэй 5 гр. 7-годкі
ПЛАТА ЗА КУРС 33 РУБ.
праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, а ніх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.
Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасе:
Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.
На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

Праектна-канструктарская кантора БУДАБ'ЯДНАНЬНЯ ВСНГБ
даводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў, што яна
ПРЫМАЕ НА СЯБЕ
складаньне праектаў, распрацоўку канструкцый і разьлікаў, рабочых чарцяжоў і каштарысаў
на фабрычна-заводзкія і грамадзкія пабудовы для будаўнічых работ на 1931 год.
Адрас: Менск, Рэвалюцыйная, 3
Праектна-канструктарская к-ра Будаб'яднаньня.

Беларускаму мэханіка-машына-будаўнічаму інстытуту ў Гомелі (памяшк. был. кіраўн. Зах. чыг.)
ПАТРАБУЮЦЦА:
1. Выкладчык матэматыкі і фізыкі для курсаў па падрыхтоўцы ў інстытут.
2. Два інжынэры на пасаду дэманстратараў і іраўнікоў вытворчай практыкі студэнтаў; практыка будзе праходзіць у гарачым і халодным цэхах масцовых мэханічных заводаў.
Работа сталая. Аплата па згодзе.
3. Загадчык арганізуемымі пры інстытуце курсамі завочнага навучаньня.
Мяркуецца папярэдняя пасылка ў Маскву для інструктажу.
Аплата па згодзе.
Дырэкцыя.

Вазьму на кватэру
вучня 7-мі годкі, магчыма са сталом. Званіць 2-95 Будакімаву.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ
з 2-х пакояў в усякі выгодзі ў цэнтры гор. Віцебску на 1-2 пак